
Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ



Наша слова



Газета выходзіць з сакавіка 1990 года № 6 (545) 6 ЛЮТАГА 2002 г.

Прапанова *Сакратарыяту Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны* з нагоды конкурсу на новы беларускі гімн

Таварыства беларускай мовы падтрымлівае ідэю правядзення конкурсу на новы беларускі гімн. У сувязі з гэтым прапануем у якасці гімна Рэспублікі Беларусь зацвердзіць любімую і папулярную ў народзе песню **"Магутны Божа" на словы Наталлі Арсенневай, музыка Міколы Равенскага** .

Наша прапанова палягае ў тым, што пераважная бальшыня грамадзян Беларусі хрысціяне, і ў нашай краіне існуюць трывалыя хрысціянскія традыцыі. Таму мы ўпэўнены, што **"Магутны Божа"** будзе спрыяць кансалідацыі людзей ў моцную супольнасць і натхняць іх на штодзённую стваральную працу.

Мы лічым, што **"Магутны Божа"** - найбольш прыдатны варыянт нацыянальнага гімна, як па велічнасці і прыгажосці музыкі, так і па глыбокім змесце.

31.01.2002.
г. Менск.

Заява Сакратарыяту Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны

Спыніць пераслед Саюзу беларускіх пісьменнікаў

Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны рашуча асуджае дзеянні ўладных структур, накіраваныя на метадычнае маральнае і фінансавае ўдушэнне пісьменніцкай арганізацыі.

Цягам апошніх пяці гадоў Саюз пісьменнікаў церпіць знявагі, абразы і здзекі. Спачатку забаранілі называцца Беларускім, затым адабралі маёмасць, пазбавілі ўсялякіх сродкаў для існавання і пастаянна ў дзяржаўных сродках масавай інфармацыі здзекаваюцца з тых, хто складае гонар беларускай літаратуры, гонар беларускай нацыі. Вядомы культурна-асветніцкі асяродак сталіцы Дом літаратара ператварылі ў "раскіданае гняздо".

Усё гэта робіцца тымі, хто, маючы ўладу, зацята змагаецца з аплотам беларушчыны, з беларускай мовай, на якой ствараецца пераважная бальшыня твораў нашых пісьменнікаў. Такія дзеянні інакш, як вандалізмам, не назавеш.

Сёняшнія ўладары Беларусі! Пакайцеся перад Богам і людзьмі, вярніце нарабаванае і спыніце пераслед пісьменніцкай арганізацыі.

31. 01. 2002 г.

ТБМ патрэбна фінансавая дапамога

Дарагія сябры! Чытачы і падпісчыкі "Нашага слова"!

Зараз мы збіраем ахвяраванні на выданне беларускіх каляндарыкаў з партрэтамі Браніслава Тарашкевіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Ігната Дамейкі і Міхася Ткачова, а таксама сродкі на падпіску газеты "Наша слова" вясковым і школьным бібліятэкам, якія не маюць на гэта грошай.

Просім вас прыняць актыўны ўдзел у гэтай пачэснай справе. Калі Вы жыхары Менска, то грошы можна прынесці непасрэдна ў нашу сядзібу, што на вуліцы Румянцава, 13 (кожны дзень, акрамя выхадных, з 10.00 да 19.00). Таксама ахвяраванні можна пералічыць на наш разліковы рахунак № 3015212330014 у МГД АТ "Белінвестбанк" г. Менска, код 764 альбо выслаць паштовым пераводам на адрас: ТБМ імя Ф. Скарыны, 220005, Менск, вул. Румянцава, 13.

Просім таксама тых сяброў, якія па нейкіх прычынах не здалі сяброўскія складкі за мінулы год (1.000 руб. для тых, хто працуе; 300 - пенсіянеры і студэнты, 100 - школьнікі), прынесці іх у сядзібу альбо пераслаць па пошце.

Тыя, хто жадае падтрымаць вышэйзгаданую ініцыятыву, могуць заплаціць складкі і за гэты год (2.000 руб. для тых, хто працуе; 1000 - пенсіянеры і студэнты, 400 - школьнікі).

Таксама мы працягваем выдаваць прыгожыя новыя пасведчанні сябра ТБМ коштам 1.200 рублёў. Калі ласка, прынясіце альбо дасылайце нам свае фотаздымкі памерам 3х4 і наступныя звесткі пра сябе: год нараджэння, месца працы ці вучобы, дакладны адрас з паштовым індэксам і разборліва напісаныя імя, прозвішча і імя па бацьку.

Усе сабраныя сродкі будуць выдаткаваныя на вышэйзгаданыя справы ды іншыя культурна-асветніцкія праекты ТБМ.

Чакаем Вашых допісаў, прапаноў і падтрымкі.


З павагай
Старшыня ГА "ТБМ імя Ф. Скарыны" Алег Трусаў.



Ахвяраванні на ТБМ

1. Сафро М.З. – 5000
2. Нікітчанка А.В. (Менск) – 5000
3. Чэчат Алесь (Менск) – 5000
4. Супрац. БелаПАН – 39000
5. Ада Райчонак (Шаркаўшчына) - 15000
6. Сям'я Адамовічаў (Менск) – 10000
7. Шупеньла Сяргей (Менск) – 5000
8. "Каляднікі" (Менск) – 1000
9. Суполка Гістфака БДУ (Менск) – 1000
10. Казлеўская І -- 800
11. Кановіч Алесь -- 10000
12. Шкірманкоў Фелікс -- 5000
13. Бакуновіч Наталля -- 1000
14. Верняковіч Л. В. -- 1000
15. Ляўчук Міхась -- 1500

Споўнілася 110 гадоў з дня нараджэння Рыгора Шырмы



Прэм'ер-міністру Рэспублікі Беларусь сп. Навіцкаму Г. В.

Паважаны Генадзь Васілевіч!

У студзені гэтага года споўнілася 110 год з дня нараджэння Рыгора Раманавіча Шырмы – знакамітага беларускага музычнага і грамадскага дзеяча, вядомага фалькларыста, публіцыста і харавога дырыжора.

У сувязі з гэтым просім Вас устанавіць помнік Рыгору Шырме ў г. Пружаны Берасцейкай вобласці, надаць яго імя музычным школам у Горадні і Менску, а таксама ўстанавіць яго бюст перад уваходам у Дзяржаўную філармонію на праспекце Францішка Скарыны ў Менску.

З павагай
Старшыня ТБМ імя Ф. Скарыны **Алег Трусаў.**

(Матэрыял пра Рыгора Шырму чытайце на ст. 2.)

Творчае моладзевае аб'яднанне **"Вятрак"**, якое займаецца прапагандай беларускай мовы, культуры, гісторыі, пачынае рэалізоўваць рэспубліканскі праект "Мы разам – за беларускую мову". У ім прымуць удзел болей за дзесяць грамадскіх арганізацый з розных гарадоў і вёсак нашай рэспублікі.

Падчас праекту будуць праведзены паэтычныя вечарыны, школьныя мерапрыемствы, акцыі; будзе выпускацца штомесячны інфармацыйны бюлетэнь; будуць выдавацца кніжачкі для дзяцей першых-другіх класаў і распаўсюджвацца сярод іх. Таксама прадстаўнікі арганізацый выступяць з заклікам да бацькоў аддаць сваіх дзяцей у беларускамоўныя школы/класы.

Па ўсіх цікавячых пытаннях можна звярнуцца да нас па адрасу: Гарадзенская вобласць, Слонімскі раён, вёска Мірная, 231825, ТМА "Вятрак", Алегу Шэлеставу, або па тэлефоне (01562) 9-11-04, Алег.



Сын свайго этнасу

У студзені гэтага года вядомаму беларускаму фальклярысту, публіцысту, харавому дырыжору, музычнаму і грамадскаму дзеячу Беларусі Рыгору Раманавічу Шырме споўнілася 110 год з дня нараджэння.

Шырма нарадзіўся ў Заходняй Беларусі, на Пружаншчыне, у сялянскай сям'і. У 1918 годзе скончыў настаўніцкі інстытут і працаваў настаўнікам у розных школах Заходняй Беларусі. Не маючы спецыяльнай музычнай адукацыі, але вельмі таленавіты ад прыроды, ён усё сваё жыццё прысвяціў стварэнню народных харавых калектываў у розных гарадах і мястэчках Беларусі.

Спачатку гэта былі народны хор у Пружанах, хор Беларускай гімназіі і хор Беларускіх студэнтаў у Вільні. Адначасова ён займаў актыўную грамадскую пазіцыю, быў адным з заснавальнікаў Таварыства беларускай школы, дзе працаваў сакратаром Галоўнай управы з 1926 па 1937 год. Вельмі падтрымліваў заходнебеларускіх пісьменнікаў і паэтаў, выдаў за свае сродкі зборнік паэзіі Максіма Танка "На этапах" у 1936 годзе. За сваю свядомую беларускую пазіцыю двойчы быў зняволены польскай уладай.

Пасля 1939 года Рыгору Шырме пашанцавала. Разам з Максімам Танкам ён актыўна ўпісаўся ў савецкую інтэлігенцкую эліту. У 1940 годзе ў Беластоку Шырма стварае беларускі ансамбль песні і танцу. Атрымаў за сваю працу званні народнага артыста БССР і СССР, зорку Героя Сацыялістычнай Працы. Доўгі час быў народным дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР і Старшынём праўлення Саюзу кампазітараў БССР. З 1910 года да канца сваіх дзён (памёр у 1978 годзе), ён збіраў беларускія народныя песні і выдаў шэраг фальклёрных зборнікаў, сярод іх вылучаецца зборнік "Дзвесце беларускіх народных песень", які выйшаў у 1958 годзе. Дзякуючы Шырме, у 1959-1976 гг. выйшла чатырохтомнае выданне "Беларускія народныя песні".

Аднак не гледзячы на розныя савецкія рэгаліі, ён ніколі не цураўся беларушчыны, карыстаўся беларускай мовай у штодзённым жыцці, руплівa працаваў з маладзю, прышчэпліваючы ёй любоў да беларускай песні, мовы, старажытнага народнага фальклору.

Пра Шырму шмат пісалі, але яго 110-гадовы юбілей мабыць, прайшоў бы ў багатым на юбілеі славутых беларусаў 2002 годзе амаль незаўважаным, каб не кніга, прысвечаная яго савецкай частцы жыцця, якая пабачыла святло менавіта ў юбілейныя дні.

Напісаў яе адзін з малодшых вучняў Шырмы Аляксандр Жураў і даў сваёй працы прыгожую назву "Жыццё з песняй". А.В. Жураў паўтара дзесятка гадоў спяваў у капэле пад кіраўніцтвам Рыгора Раманавіча. У яго скламіся даволі блізкія адносіны са сваім мастацкім кіраўніком і таму да яго трапілі рэдкія дакументы і фотаздымкі пачынаючы з 1940 года. Сярод іх унікальны дзённік выступленняў капэлы Шырмы, хроніка не канцэртаў за 30 год, пачынаючы з першага канцэрта ў Беластоку 23 лютага 1940 года.

Акрамя аўтарскіх успамінаў, у кнізе Журава знайшлося месца ўспамінаў пра Шырму пісьменніцы Ніны Загорскай і артыстаў Міхася Шуманскага і Людмілы Сцяфанавай, Раісы Вол, Галіны Ламакінай і Мікалая Лукашука.

Калі ўважліва прачытаць кнігу, можна даведацца пра шмат якія цікавыя факты з жыцця і дзейнасці Рыгора Шырмы. Напрыклад, пра арышт Рыгора Шырмы сталіністамі ў першыя дні вайны, у чэрвені 1941 года. У гэты час ансамбль Шырмы выступаў у рускім горадзе Арле на мабілізацыйных пунктах. Праслухаўшы некалькі канцэртаў, мясцовыя ахоўнікі парадку абвінавацілі Рыгора Раманавіча ў нацыяналізме у сувязі з вялікай колькасцю ў праграме беларускіх народных песень і танцаў і арыштавалі, а ансамбль хацелі распусціць.

23 чэрвеня 1941 года затрыманых артыстаў перавезлі ў Маскву і пачаліся допыты. Аднак, пасля просьбы Беларускага ўрада калектыў захавалі, Шырму вызвалілі з-пад варты, але рэпэртуар цалкам змянілі. 29 чэрвеня ў Крамлі адбываецца канцэрт для работнікаў НКУС, пасля якога пагроза мінавала.

Але лепей пагартаем унікальны дзённік канцэртаў капэлы Шырмы. Ужо 1 студзеня 1944 года калектыў, які вярнуўся ў Беларусь, дае першы канцэрт у Нова-Беліцы пад Гомелем з нагоды 25 угодкаў стварэння БССР. 28 чэрвеня ў Нова-Беліцы адбываецца вечарына, прысвечаная 2-й гадавіне з дня смерці Янкі Купалы. І гэта ў тыя часы, калі нават гаварыць пра абставіны гэтай трагедыі было строга забаронена. 16 ліпеня адбыўся першы выступ у вызваленым ад фашыстаў Менску і дзе-небудзь, а на Парадзе беларускіх партызан. Другі канцэрт для партызан адбыўся на Камароўцы 10 верасня. З 7 кастрычніка Дзяржаўны ансамбль песні і танца БССР знаходзіцца ў Горадні, дзе адбываецца яго першы выступ у гарадскім тэатры. У Горадні калектыў Шырмы ў 1950 годзе атрымаў новую назву – Дзяржаўны хор БССР.



З 1952 года артысты пераязджаюць на сталае жыхарства ў Менск. Увесь гэты час артысты прапагандуюць народную музыку, спевы і танцы ў розных гарадах і мястэчках Беларусі, асабліва ў заходняй яе частцы. Зрэдку выступаюць нават у школах, прычым да 1959 года, калі большасць гарадскіх школ яшчэ былі беларускімі, Шырма дакладна пазначыў у дзённіку выступы ў школах з іншай мовай навучання. Напрыклад, 31 студзеня 1945 года ў Лідзе канцэрт прайшоў у рускай школе, а 28 снежня 1947 года – на выбарчым участку ў Горадні, у памяшканні польскай школы. 14 студзеня 1956 года артысты выступілі перад вучнямі і настаўнікамі 37 рускай школы ў Менску.

Цікава, што ў сакавіку 1945 года захоўваліся такія старыя назвы беларускіх гарадоў, дзе выступаў калектыў Шырмы, як Брэст-Літоўск і Высокалітоўск. Назва Брэст-Літоўск пазначана ў дзённіку Шырмы ў сакавіку 1947, 1948 і 1950 года.

Па падліках Аляксандра Журава, за 30 год сваёй дзейнасці ансамбль Шырмы правёў 5000 канцэртаў, з іх на тэрыторыі Беларусі – 3286. У 1970 годзе Шырма пакінуў працу ў капэле і пайшоў на адпачынак.

Нельга не пагадзіцца з Аляксандрам Журавым у тым, што "Рыгор Раманавіч Шырма – з'ява глыбока нацыянальная, фенаменальная. Як і ўсякі нацыянальны феномен, ён увабраў у сябе ўсё лепшае, што ёсць у народзе, у яго творчасці – мудрасць, высакародства. І, галоўнае, - усведамленне сябе сынам свайго этнасу, служыць яму сэрцам і душой".

Тым, хто жадае набыць такую цікавую кнігу мы раім звярнуцца ў кніжную крамку Беларускага Дзяржаўнага ўніверсітэта культуры (на другім паверсе галоўнага корпусу), а таксама ў магазін "Ноты", які размешчаны на вуліцы Леніна ў цэнтры Менска. Наклад кнігі – 1000 асобнікаў.

Алег Трусаў.

У памяць Браніслава Тарашкевіча

Якія мы?

– А што, сынок, беларускі народ варты, каб ты за яго склаў сваю галаву? (Пытанне Адама Тарашкевіча да сына)

Усё на гэтым свеце мае сваю логіку і мернасць. І святкаванне юбілеяў усталявалася невыпадкова. Юбілеі даюць магчымасць згадваць нам найважнейшыя старонкі нашай гісторыі, яе слаўных сыноў, іхнія заслугі перад сваім народам, Бацькаўшчынай.

... Браніслаў Тарашкевіч першы даў нашаму народу граматыку беларускай мовы для школ. Усе сёняшнія школьныя граматыкі роднай мовы бяруць выток з Тарашкевічай граматыкі. А гэта значыць, што юбілей слыннага граматыста павінны быць усенародныміі. Усе грамадзяне Беларусі прайшлі праз граматы-кі, усе спазналі граматыку праз падручнікі роднай мовы. Аднак нашай афіцыйнай грамадзе, а за ёй і астатняму люду агульналюдскія зако-ны не заўсёды пісаны.

Юбілеі слыннага граматыста – 110-ую гадавіну з дня яго народзінаў – адзначылі толькі паасобныя ўстановы. Сярод іх і сталічны кінатэатр "Змена". Удзельнікам імпрэзы прапанавана было паглядзець аж тры шчымлівыя дакументальныя стужкі. Прынамсі: "Зямля Тарашкевіча", "Браніслаў Тарашкевіч", "Дзядзька Уласаў". А паміж праглядам стужак сваімі развагамі, як хто адчувае і разумее Тарашкевічаву постаць, з прысутнымі падзяліліся народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч, даследчыкі Тарашкевічавай спадчыны Арсень Ліс і Уладзімір Содаль, старшыня Таварыства беларускай мовы Алег Трусаў. Шмат цікавага пачулі прысутныя пра Браніслава Тарашкевіча пра яго апошнія драматычныя месяцы жыцця ад доктара гістарычных навук прафесара Уладзіміра Міхнюка.

Імпрэза ў кінатэатры "Змена", безумоўна, для ўсіх прысутных сталася незабыўнай. А для астатніх?

На жаль, ні наша радыё, а тым больш тэлебачанне, ні шматлікія друкаваныя выданні краіны ні словам не заікнуліся пра слыннага граматыста і дзяржаўнага дзеяча, вучонага з нагоды яго юбілею.

Што б усё гэта значыла? Пра што ўсё гэта сведчыць?

Ва ўсіх цывілізаваных краінах ушанаванне слынных сыноў свайго народу ёсць святая справа. Чаму ж у Беларусі святая справа становіцца выключэннем?! Сумна, панове! Вельмі сумна! Грэх забывацца пра тых, хто клікаў свой народ з цемры да святла, хто ахвяраваўся сваім жыццём дзеля лепшай нашай будучыні.

На імпрэзе ў кінатэатры "Змена" прысутныя пазнаёміліся і з Тарашкевічавымі сваякамі і Аляксандра Уласава: Ірынай Ніжанкоўскай і Рымай Гірыловіч, якія, як могуць, дбаюць пра спадчыну сваіх слынных продкаў, рупяцца, каб гэтая спадчына не расцярушылася на шляхах нашай гісторыі.

Заключыў верачыну сваім вершам, прысвечаным Б. Тарашкевічу, Сяргей Панізнік. Кіраўнік клуба "Спадчына" Анатоль Белы расказаў прысутным, як згаданая суполка ўшаноўвае змагароў за роднае слова. Сярод узнагародаў, між іншым, клуб мае і медаль "Браніслаў Тарашкевіч".

Ладымер Хтоцкі.

З далёкім прыкідам

(З разваг падчас імпрэзы ў кінатэатры "Змена")

У 1933 годзе Тарашкевіча абмянялі на Аляхновіча.

Навошта Саветам спатрэбіўся гэты абмен: аднаго беларуса мяняць на другога?! Ці задумаўся пра гэта Тарашкевіч? Чаму даверыўся? Чаму не задумаўся? Калі так добра ў Радавай Беларусі, то чаго ж з яе так ляціць Аляхновіч? Хіба Тарашкевічу за санацыяй Пілсудскага не было могі? Паспадзяваўся, што ў Радавай Беларусі яму дадуць разгарнуцца... Ну, але мы ведаем, як абышліся з Тарашкевічам камісары Беларусі. Яны не толькі не далі яму магчымасці будаваць беларускі дом па-беларуску, але і жыць не дазволілі ў Беларусі...

Дык навошта рабіўся гэты абмен?

Мабыць, у Радавай улады былі далёкія прыкіды...

Хто такі Аляхновіч?

Усяго-наўсяго – драматург. Абсяг яго дзейнасці – якісь тэатр... А Тарашкевіч – спрактыкаваны, актыўны палітычны дзеяч. Стварыў статысячную Грамаду – арганізацыю, якая будзе надалей замінаць Саветам, усталёўваць у Заходняй Беларусі камуністычную ідэалогію і русіфікацыю. То ці не лепш загадзя, яшчэ да верасьнёўскага паходу, абяскровіць беларускую Грамаду, расхістаць яе, а самога стваральніка выманіць з Заходняй Беларусі і вынішчыць, што і зрабілі. І невядома яшчэ, хто былі яго набліжаныя ў Маскве. Ці не прыстаўленыя ад нкэвэдэ?

Ва ўсім разе радавыя камісары ўсю рэштку Тарашкевічавага жыцця скіравалі на вынішчэнне, з чым яны справіліся паспяхова. Тарашкевіч з сваёй Грамадой не ўпісваўся ў інтэрнацыянальныя пастулаты камуністаў. Такія, як ён, не павінны былі замінаць усталяванню "усенароднага шчасця" на зямлі. От пад такую бальшавіцкую формулу і падпаў Тарашкевіч і ўсе ягоныя аднадумцы.

Уладзімір Содаль.

Слова ўдзячнасці

Час ад часу бываю на творчых вечарынах у кінатэатры "Змена". І хачу з удзячнасцю сказаць, што кіраўніцтва і канкрэтныя арганізатары робяць вялікую справу – справу сапраўды патрыятычнага выхавання нашага грамадства, паказваючы ў сваёй кіназале перш за ўсё не выдуманыя, а сапраўды дакументальныя гістарычныя людзі нашай гісторыі – дакументальныя фільмы так неабходныя для захавання нашай гістарычнай памяці пра слаўныя падзеі, сыноў Бацькаўшчыны гістарычных і сучасных.

Дзякуй арганізатарам, выступоўцам за 110-я ўгодкі слаўнага сына Беларусі Браніслава Тарашкевіча, Аляксандра Уласава – выдаўца і рэдактара "Нашай нівы".

Дай Бог усім са "Змены" здароўя і доўгіх гадоў жыцця!

Л. Акаловіч.

Вельмі ўдзячны дырэкцыі к/т "Змена" за правядзенне вечарыны, прысвечанай 110-м угодкам з дня нараджэння Б. Тарашкевіча, а таксама за прагляд стужак "Зямля Тарашкевіча" і інш. Мы жадаем кіраўніцтву к/т "Змена" далейшых поспехаў на ніве працы па захаванню гістарычнай памяці беларускага народа.

Нашчадкі роду Уласавых
Уласава, Ніжанкоўская.

Шчыры дзякуй за фільмы пра жыццё і дзейнасць Браніслава Тарашкевіча, за магчымасць чуць і бачыць людзей неабыякавых да гісторыі Беларусі, што яны нясуць народу Беларусі на агульны спажытак і дапамогу ў нялёгкі час выпрабаванняў.

Ст. лабарант Музея старажытнабеларускай культуры пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклёру НАН Беларусі Ігар Карашчанка.

У памяць Браніслава Тарашкевіча

Браніслаў Тарашкевіч, якім яго ведалі родныя і землякі

Матэрыялы нашых вандровак па Віленшчыне ў 1992-1993 гг., калі аўтару гэтых радкой пашчасціла пабываць у розных мясцінах былой Лаварышскай гміны Віленска-Троцкага павету (цяпер Вільнюскага раёна Літоўскай рэспублікі), у прыватнасці ў наваколлі



Традыцыйнае гумно, якіх шмат на Віленшчыне. Дарога з Кяны да Чарнулішак. Восень 1993 г. Фота І. Карашчанкі.

родных Браніславу Тарашкевічу Чарнулішках, дзе ён вельмі часта бываў (з Чарнулішкаў родам была яго маці, а некаторыя з родных лічаць, што Браніслаў Адамавіч нарадзіўся там, а не ў Мацюлішках). Тады я і даведаўся з расповедаў яго родных, як, прыкладам, пляменніцы Браніслава Марыі Восіпаўны Багдановіч (у дзявоцтве Тарашкевічанка, 1922 г. нар.), якім быў Браніслаў Адамавіч для сваіх родных і блізкіх. "Ён не любіў засмучацца, залішне бедаваць, - згадвала Марыя Восіпаўна. Падбадзёрваў сваіх блізкіх. Пры гэтым любіў звярнуцца ў пісьме да сваіх вершыкам. Выкарыстоўваў, як бы хто сказаў, матывы беларускага народнага фальклёру. У адным з лістоў да родных ён пісаў верш:

"Гараў я над гарою,
Дык і плуг зламаўся.
Ну ні плакаў я над сабою,
Дык сеў і засмяяўся".

Пісаў, што прывык да гаравання.

У 1932 годзе пасля арышту яго ў 1931 годзе. У час пераезду з Данцыга (Гданьска) у Рыгу – у Тчэве – з Лукішскай турмы ён у вершах пісаў пра брата Юзіка і швагера Гароніма, якія будавалі тады нешта ў сваёй гаспадарцы, так:

Спічастыя бароды
Цягалі калоды
Бярвенні і латы
На гумны і хаты.
Народ не багаты, -
Так нас ушчамілі
(у сэнсе: улады абкладалі сялян падаткамі)
Што і свет ня мілы,
Аднак ні чагуткі –
Ні беды, ні смуткі
Засвеця сонца
І ў наша ваконца.

"Пісаў нібы вершыкамі і нігды не бедаваў за сабой. Усім суседзям перадаваў паклоны", - казалі нам родныя Браніслава Тарашкевіча. У час суда Браніслаў заклікаў свайго бацьку пазбавіцца наёмных працаўнікоў, набыць сельскагаспадарчую машыну, каб машынамі самім абрабляць зямлю. Браніслаў любіў народную песню. Было што як пойдзе касіць, знекуль дадаму прыехаўшы, дык спявае са ваімі хлопцамі:

На вайну, сынок, паедзеш
І стуль не прыедзеш,
Панясеш ты плечы
Пад нямецкія мечы.
Панясеш ты галоўку
У чужую старонку…

Паказалася прывабнай такая побытавая рысачка. Дома, як еў, Браніслаў вельмі любіў есці з патэльні. Вясёлы нораў, жыццялюбнасць, сказаліся на яго адносінах з мясцовымі служыцелямі каталіцкага касцёла, якія, між іншым, былі вядомы ў наваколлі сваёй беларускай нацыянальнай свядомасцю. У Лаварышскім касцёле пэўны час быў арганіст Пазняк (пазней з артыкула ў "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" я даведаўся, што гэта быў Янка Пазняк (жыў з 1887 да пасля 1939 года), у 1928 – недзе пасля 1931 года – сакратар Прэзідыюму ЦК Беларускай Сацыяльнай Дэмакратыі. Дык Браніслаў Тарашкевіч неяк жартам падгаварыў яго ў вечары зайграць "Зялёны дубочак". Вось такі жыццялюбівы гарэза быў у маладосці Браніслаў Тарашкевіч. Але трэба адзначыць – гэта было пабач са шчырай павагай вернікаў. Як быў маленькім, Браніслаў хацеў быць ксяндзом. Расказвалі, што ўсё ўбіраўся белым (у белае), як бацькі ідуць да касцёла, і "служыў", адпраўляў імшу ў хаце. Маці яго хацела, каб ён стаў ксяндзом, каб паступіў вучыцца ў духоўную семінарыю. На што Браніслаў, пасталеўшы, сказаў: "Ксяндзом добрым быць надта цяжка, а быле якім не хачу". Пасля абраў сабе ў жыцці іншую дарогу. Дарогу вучонасці ў імя свайго народа і чалавецтва. Даведаўшыся, што тады, у 1990-я гады ў Вільню мяне запрашалі прыехаць і азнаёміцца з гісторыяй і культурай беларушчыны Віленшчыны, прыхінуцца да гэтай крыніцы жыцця віленскіх беларусаў, Марыя Восіпаўна сказала проста: "Там у Вільні ўжо ёсць беларусаў настаяшча" (відавочна маючы на ўвазе дзесяцігоддзі рэпрэсій, тых, ці іншых неспрыяльнасцяў для нармальнага існавання і развіцця беларушчыны Віленшчыны.

Марыя Восіпаўна распавядала, што добрым знаёмым Браніслава Тарашкевіча і яго родных у Вільні быў ксёндз і грамадскі дзеяч Адам Станкевіч. Ён прыязджаў з Вільні і хрысціў разам з Тарашкевіч Верай (жонкай Браніслава), прычым тады Тарашкевіч Вера была ў якасці хроснай маці, у вёсцы Невярышкі (што па дарозе з Кяны, праз вёску Невярышкі, хутар Палестына, вёскі Гражулішкі, Пятрулішкі да Тарашкевічавых Чарнулішкаў). Азначаную дарогу я добра ведаў, прайшоўся пад добры маразец пешшу ў лістападзе месяцы. Унекалькіх вёсках, у тым ліку і ў Пятрулішках, мяне зацікавілі вялікія, збудаваныя ў традыцыйным для сучаснага беларуска-літоўскага памежжа выглядзе гумны. Гаспадаром такога гумна ў Пятрулішках аказаўся аднайменнік, што да прозвішча Браніслава Тарашкевіча (Казімір Іванавіч Тарашкевіч) яго гумно было пабудавана ў 1930 годзе, з кім мы і паразмаўлялі. Добра, прыязна. Па-беларуску. "Настаяшча" па-беларуску. З Віленскіх беларусаў, знаёмых Браніслава Тарашкевіча і яго родных Марыя Восіпаўна згадала чалавека з прозвішчам Пірышка. І дадала: "Ён сядзеў у турме разам з Браніславам Тарашкевічам". Дзядуля, так называла ў размове са мной Марыя Восіпаўна Адама Людвігавіча (бацьку Браніслава), памёр, чакаючы вызвалення сына, у лістападзе 1931 года.

І. Карашчанка
(Менск, ІМЭФ НАН Беларусі.)



На вуліцы адной з вёсак Віленскага раёна бліжэй да Тарашкевічавых Чарнулішак. Восень 1993 г. Фота І. Карашчанкі.

"Угодкі Браніслава Тарашкевіча ў Вільні"

20 студзеня споўнілася 110 гадоў з дня нараджэння вядомага вучонага, грамадскага дзеяча Бр. Тарашкевіча.

"Літаратурная спадчына Браніслава Тарашкевіча, хоць жыццё таленавітага пісьменніка і вучонага было рана абарвана, - даволі багатая і разнастайная яе складаюць публіцыстыка, літаратуразнаўства і пераклады. Калі крытычныя і літаратуразнаўчыя нататкі Тарашкевіча могуць толькі засведчыць аб нерэалізаваных магчымасцях яго ў гэтым жанры, то мастацкая публіцыстыка і пераклады – бясспрэчны здабытак усёй беларускай літаратуры і культуры ў цэлым. Публіцыстычная творчасць Тарашкевіча ўзыходзіць да лепшых нацыянальных традыцый у гэтым жанры – рэвалюцыйна-дэмакратычнай грамадскай думкі К. Каліноўскага, яго "Мужыцкай праўды". Яна тычыцца многіх фундаментальных праблем, якія маюць непраміальнае значэнне для жыцця нацыі. Нарэшце, пранікнёнае, мужнае, палымянае слова Тарашкевіча даносіць да сучаснага пакалення, што заступае на новы грамадскі рубеж, непаўторны вобраз эпохі барацьбы і надзей, - піша ў прадмове да кнігі Бр. Тарашкевіч "Выбранае"Арсень Ліс. У 1992 годзе ў Нью-Ёрку перавыдадзена "Беларуская граматыка" Бр. Тарашкевіча.

"Гэтая граматыка адыграла вядучую ролю ў развіцці беларускай літаратурнай мовы, стандартызацыі правапісу, па ёй вучыліся тысячы вучняў. Але ў 1930 годзе гэты падручнік, як і дзесяткі іншых беларускіх падручнікаў і кніжак, быў забаронены і знішчаны савецкай уладай. Знішчыла савецкая ўлада і Браніслава Тарашкевіча. Асабліва трагічная пара настала для беларускай мовы. У Мінску была праведзена г. зв. рэформа беларускага правапісу ў 1933 годзе, у выніку якой насуперак натуральнаму развіццю мовы, пачалося штучнае набліжэнне беларускай мовы да мовы расейскай. Гэты гвалтоўны працэс, нажаль, не спынены і да цяперашняга часу, ды і калечанне беларускай мовы прадаўжаецца. Аднак накінутыя русіфікатарскія мерапрыемствы мусяць скончыцца!" – гэта словы да перавыдадзенай граматыкі Беларускім Інстытутам Навукі і Мастацтва.

Першыя вучні віленскай беларускай школы карысталіся граматыкай Тарашкевіча, аднак у пятым класе, на жаль, пачалі пісаць наркомаўкай, так як у Беларусі тарашкевіца не ўзаконена. Спадчына яго да гэтага часу недастаткова даследавана і ацэнена. *"Перш з-за таго, што не франтальна прасочаны польскі і ўвесь заходнебеларускі перыядычны друк 20-30-х гадоў, а па-другое, не ўсе псеўданімы Тарашкевіча расшыфраваны"*, - Арсень Ліс канстатуе ў той жа прадмове. Захапляюць яго мужныя прамовы і выступленні на паседжаннях Сейму ў абарону свайго народа і незалежнасці. Мы ведаем Бр. Тарашкевіча, як аўтара "Беларускай граматыкі", выдадзенай ў Вільні ў 1918 годзе, як грамадскага і палітычнага дзеяча, як абаронцу беларусаў напрыканцы мінулага стагоддзя. Ён нарадзіўся недалёка ад Вільні ў вёсцы Чарнулішкі, у 1930 годзе Бр. Тарашкевіч апошні раз наведаў родныя мясціны, у 1931 яго арыштавалі, а ў 1933 абмянялі на драматурга Фр. Аляхновіча. У 1994 годзе ў Вільні на вуліцы Віленскай, дзе нейкі час жыў вучоны ўстаноўлена ТБК табліца ў гонар яго. На ўрачыстасцях прысутнічаў тады народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў, у Таварыстве Беларускай Культуры Літвы адбылася вечарына. Калі адзначалася 100 годдзе з дня нараджэння Тарашкевіча, група актывістаў ТБК наведала Радашкавічы. У 1997 годзе з вучнямі беларускай школы пабывалі на радзіме Браніслава, сустрэліся з яго пляменніцай цёткай Марыяй і цёткай Лёняй. Цётка Марыя памятала свайго дзядзьку, яна яму пісала лісты. Ён адзін з сям'і выбіўся ў вялікія людзі, і ўсім наказваў вучыцца, бо непісьменным будзе вельмі цяжка жыць. Нягледзячы на цяжкасці, арышты, перашкоды змагаўся Бр. Тарашкевіч за свой народ. Удзячныя нашчадкі памятаюць аб сваім слынным абаронцы. У Таварыстве Беларускай Культуры адбылася ўрачыстая імпрэза "Браніславу Тарашкевічу – 110 г.", у беларускай школе імя Фр. Скарыны аформлены стэнд, у бібліятэцы – выстава кніг, а 20 студзеня ў дзень яго нараджэння – адкрытыя ўрокі па беларускай мове. Шмат робіць для ўшанавання памяці вучонага і ТБМ імя Фр. Скарыны віленскага краю (Ю.Гіль). Уперадзе яшчэ шмат працы. У планах ТБМ адкрыццё таблічы на будынку школы ў Лаварышках, там ён вучыўся, там пахаваны яго продкі. Прыйдзе час, калі павернецца да натуральнага працэсу развіццё беларускай мовы і культуры, і тады "тарашкевіцы" будзе належаць першая роля".

Леакадзія Мілаш,
г. Вільня,
21 студзеня 2002 г.



26 снежня 2001 г. №_______

Старшыні Мінскага аблвыканкаму
сп. Дамашкевічу М. Ф.
220030, г. Мінск, вул. Энгельса, 4

Шаноўны Мікалай Фёдаравіч !

Мы ведаем Вас як адказнага дзяржаўнага дзеяча, які прыхільна ставіцца да беларускай мовы, і таму не сумняваемся, што пад Вашым непасрэдным кіраўніцтвам Упраўленне адукацыі Мінскага аблвыканкама разгарнула дзейнасць па выкананні Пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь "Праграма дадатковых мер па пашырэнні сферы выкарыстання беларускай мовы ў сістэме адукацыі" № 48 ад 27.08.2001 года.


Мы лічым, што ў адпаведнасці з пунктамі І.3., ІІІ. 1.2. і V. Пастановы варта было б, у першую чаргу, у верасні 2002 года адкрыць Нацыянальныя гімназіі з беларускай мовай навучання ў Слуцку, Салігорску, Вілейцы, Лагойску, Барысаве, Беразіно і Заслаўі. Гэта станецца, на нашу думку, першым рэальным крокам па выкананні пункта перадвыбарчай праграмы кіраўніка нашай дзяржавы аб рэальнай роўнасці беларускай і рускай моваў.

Паведаміце нам, калі ласка, якія захады па рэалізацыі вышэйзгаданай Пастановы Вамі ўжо зроблены.

Прыміце нашыя Навагоднія і Калядныя віншаванні.

З павагай
Старшыня ТБМ Алег Трусаў.

МІНСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
УПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ
220030, г.Мінск, вул.Энгельса, 4
тэл/факс 2273482



МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
УПРАВЛЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
220030, г.Минск, ул.Энгельса, 4
тел/факс 2273482

15.01.2002 г. № 03/01-7
на № 580 ад 26.12.01 г.

Грамадскае аб'яднанне
"Таварыства беларукай мовы
імя Францішка Скарыны"

Упраўленне адукацыі праводзіць пастаянную работу па захаванні існуючых беларускамоўных школ і класаў.

У вобласці працуе 629 (75%) школ з беларускай мовай навучання. 106 (13%) школ – з дзвюма мовамі навучання. 29 сярэдніх школ маюць класы з паглыбленным вывучэннем беларускай мовы. Адным з галоўных кірункаў у рабоце ўстаноў адукацыі з'яўляецца выхаванне нацыянальнай самасвядомасці дзяцей і моладзі.

У 9 гімназіях з 20-ці навучанне вядзецца на беларускай мове, у тым ліку ў гімназіях г.г. Вілейкі, Барысава, Беразіно.

Разам з тым, у апошнія гады ў гарадах вызначылася тэндэнцыя да зніжэння колькасці дзяцей, якія паступаюць у беларускамоўныя класы. Бацькі аддаюць перавагу навучанню дзяцей у школах з рускай мовай навучання. У агульнаадукацыйных установах, якія павінны задавальняць патрэбы вучняў і іх бацькоў у адукацыі, шырокае распаўсюджанне атрымалі рознапрофільныя і ліцэйскія класы.

У г. г. Слуцку, Лагойску і Заслаўі адкрыццё гімназій з беларускай мовай навучання ў бліжэйшыя гады немагчыма, паколькі існуюць цяжкасці з фармаваннем беларускамоўных класаў. Салігорскі гарадскі аддзел адукацыі вывучае магчымасці стварэння Нацыянальнай гімназіі з беларускай мовай навучання на базе сярэдняй школы № 12 г. Салігорска.

Лічым, што пераход вышэйшых і спецыяльных сярэдніх навучальных устаноў на беларускую мову навучання значна павысіць прэстыж роднай мовы ў грамадстве.

Начальнік упраўлення Г. І. Нікановіч.

Справаздача Гарадзенскай абласной рады ТБМ

Закончыўся 2001 год, якія вынікі?

З 3 па 5 студзеня 2001 года праходзіла абласная алімпіяда па беларускай мове і літаратуры, дзе мы ўручалі пераможцам і прызёрам падарункі, аб чым пісала газета "Наша слова".

Цяжкая праца лягла на плечы сяброў ТБМ па зборы сродкаў на дзейнасць ТБМ. Дзякуючы іх намаганням абласная рада ТБМ падпісала на II паўгоддзе 2001 года 60 экз. і на I паўгоддзе 2002 года 62 экз. газет "Наша слова" для школ г. Горадні і раёна.

Было праведзена ў траўні месяцы ўдалае мерапрыемства – гэта ўручэнне падарункаў (кніг) кіроўцам тралейбусаў і аўтобусаў, якія аб'яўляюць прыпынкі па-беларуску. Папярэдне былі вельмі цікавыя сустрэчы з кіраўнікамі тралейбуснага дэпо і аўтапарка (каб пры гэтых сустрэчах прысутнічаў журналіст – то гэта быў бы найцікавейшы матэрыял для артыкула пра адносіны кіраўнікоў да беларускай мовы). Такія мерапрыемствы трэба праводзіць у г. Менску і іншых гарадах рэспублікі.

Праводзілася пэўная праца па вылучэнні нашых сяброў у склад выбарчых камісій і наглядальнікаў. Нажаль у выбарчыя камісіі нашы сябры не прайшлі, а наглядальнікамі былі акрэдытаваны амаль на 90 выбарчых участках. На гэтай хвалі ўзнікла і Шчучынская арганізацыя ТБМ.

У пачатку жніўня нашы сябры прынялі ўдзел у святкаванні 91 угодкаў народзін Ларысы Геніюш у Зэльве, а ў лістападзе ў Горадні былі падведзены вынікі конкурсу на лепшы самастойны твор сярод школьнікаў і навучэнцаў ПТВ, прысвечаны 110-годдзю народзін М.Багдановіча (конкурс ладзіла абласное ўпраўленне адукацыі) ад ТБМ пераможцам і прызёрам былі ўручаны кнігі.

31 снежня 2001 года мне дазволілі выступіць па "Радыё Гродна" у прамым эфіры толькі з віншаваннем ад імя абласной рады ТБМ з Новым 2002 годам, а выказаць пажаданні ў адрас кіраўнікоў вобласці і горада аб пашырэнні ўжывання беларускай мовы не дазволілі, але ж і за 20 секунд эфіру ім дзякуй.

На маю думку робіцца для беларушчыны мала, калі б было болей прыхільнікаў сярод службовых асоб, то нам можна было б працаваць лягчэй і зрабіць болей.

4.01.2002 г.

А. Місцюкевіч.

Павел Сцяцко

Культура мовы

Новыя моўныя знаходкі

Падчас адраджэнцкіх тэндэнцыяў узнікае шмат новых лексемаў. Як паралельных да тых, што існавалі раней, так і для абазначэння новых рэаліяў і паняццяў.

Нямала такіх неалагізмаў бачым у мастацкіх і навуковых творах маладых аўтараў. Але не адстаюць ад іх і некаторыя прадстаўнікі старэйшага пакалення. Яскравым прыкладам ёсць Рыгор Барадулін. Віртуёзнасць ягонай словатворчасці досыць выразна выявілася ў паэтычных творах. Не меней адметнага бачым і ў ягоных перакладах празаічных твораў. Спынімся на перакладзе Рыгорам Барадуліным навэлаў Ганада Чарказяна, змешчаных у часопісе "Полымя" № 10 за 2001 год.

Адразу ў тэксце кідаецца ў вочы ***аднадарожац*** як адэкват слоўнікавага ***спадарожнік***: *"Сівабароды стары сказаў аднадарожцу свайму… Гэтую размову двух аднадарожцаў чуў арол з параненым крылом"* (С.107).

Слова ***"спадарожнік"*** тлумачыцца ў слоўніках як "чалавек, які знаходзіцца ў дарозе разам з кім-небудзь" (ТСБЛМ, с. 614). Барадулінава ***аднадарожац*** якраз надта выразна перадае гэтае значэнне – *'чалавек адной дарогі з іншымі людзьмі (іншым чалавекам)'*. А вось іншае слова – ***крадзежнік*** як сінонім да лексемы ***злодзей***: *"А той, хто шчыруе, чужога не возьме, не будзе крадзежнікам"* (С.109). ***Крадзежнік*** – утварэнне з прадукцыйным суфіксам асобы ***–нік*** ад ***крадзеж***: ***крадзеж-нік***. Акадэмічныя слоўнікі яго не фіксуюць, хоць утваральнае слова ***крадзеж*** падаецца як адэкват да ***"зладзейства"***, ***"кража"*** (ТСБМ. Т.2.С.719). Праўда, бачым яго ў лексікаграфічнай працы Вацлава Ластоўскага "Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік" (Коўна. 1924. С.83): *Воровать што – красьці, крадзежа, крадзежыць, крадзежны, крадзежнік…*

Нямала ў Барадулевым перакладзе ўтварэнняў з суфіксамі ***–ец, -енец, -ц-а, -іц-а***: ***выратоўца***: *"Яны ведалі, што выратоўца ад смагі носіць ваду з далёкае крыніцы"* (С.113); ***віноўца***: *"І нібыта віноўцам быў Месяц"* (С.127); ***быліца***: *"І лясную быліцу распавяла бабуля"* (С.128); ***замужніца***: *"І засталася маладая замужніца з маленькім сынам на руках адна"* (С.121); ***заздровіца*** ("заздароўны тост"): *"За другім разам бацька прапанаваў заздровіцу: - За былога гаспадара твайго дома"* (С.125); ***сустрэнец:*** *" – Добрага здароўя, дарагі чалавек! – вітае сустрэнца курд"* (С.115); ***напатканец***: *"Супакоіўся крыху напатканец, распавёў, што даў бог ціхую і прыгожую зямлю цярпліваму й працавітаму народу, які завецца беларусамі"* (С.115).

Некаторыя з паказаных слоў выступаюць як паралельныя да ўтварэнняў з іншымі суфіксамі ці бяссуфіксавымі ўтварэннямі: ***выратоўца*** (у слоўніках: выратавальнік), ***віноўца*** (віноўнік), ***быліца*** (быль).

Выбітны пісьменнік стварае суфіксавыя найменні там, дзе ў літаратурнай мове іх няма: ***заздровіца***, ***сустрэнец*** ('сустрэты чалавек'), ***напатканец*** ('напатканы чалавек'). Бачым у Рыгора Барадуліна і адметнае слов***а хады'ка*** з значэннем *'хадок, хадун'*: *"Ён бачыў двух іншых хадыкаў, што падымаліся па той жа сцяжыне, якой прайшлі першыя"* (С.106). Гэтае слова – утварэнне з старажытным суфіксам ***–ык-а*** (больш падрабязна глядзі ў нашай кнізе "Беларускае народнае словаўтварэнне". – Мінск, 1977. С.76). З такой структурай бытуе і прозвішча ***Хадыка*** (*Юрась Хадыка, прафесар-фізік*), а таксама слова ***уладыка*** (ад ***уладаць***).

Нямала ў тэксце Барадулінавага перакладу і іншых пазаслоўнікавых лексемаў: *"Муса прысеў на сваё звычайнае седзішча ды ў нейкім здзіве пазіраў на ўсё дзеева"* (С.110). *"Даруй, Звышні, вольнасць маю"* (С.111). *"Дык жоначка насупар традыцыяў збегла з іншым"* (С.117). *"Можа, Звышні прыме кайнасць маю"* (С.118). *"І паказалі вольналюбу ягоную нарачонку, і не ўстояў, захістаўся, асілак… І зрабілася ляcному магуту журліва, узгадаў самотную дарогу"* (С.128). *"… Усё на зямлі трымаецца на згодзе, трываліцца на раўнавазе"* (С.130). *"… Раннія прыходзіны хлапчука нікога не бянтэжылі"* (С.144). *"Увойсце ў плынь свядомасці Кірвелевага героя"* (С.319).

Цікавыя лексемы бачым і ў тэксце дзённікаў Міхася Фёдаравіча Дубянецкага, змешчаным у згаданым 10-м нумары "Полымя" за 2001 год. Як напрыклад, слова ***жывец***: *"… даў я яму так ружжом у лоб, што бачыўся ўсім ён ужо не жыўцом на гэтым свеце"* (С.202). У слоўніках слова ***"жывец"*** з такім значэннем не занатавана. У іх падаецца толькі: *"Жывец – 'маленькая жывая рыбка, якая насаджваецца на кручок пры лоўлі буйной драпежнай рыбы"* (ТСБМ. Т.2.С.262). Праўда, слоўнікі фіксуюць прыслоўе: *Жыўцом – 'у жывым стане, жывым'* (Тамсама, с.266). Гэтае прыслоўе якраз і паходзіць ад формы творнага склону назоўніка ***жывец*** (кім-ч. ***жыўцом***).

Як відаць, слова ***жывец*** (адноўленае даўнейшае старажытнае слова, утворанае ад прыметніка ***жывы***) надта неабходнае для перадачы адпаведнага лексічнага значэння. Яно мае права заняць сваё месца ў слоўніку літаратурнай мовы.

Наш пратэст

ТБМ імя Ф. Скарыны Віленскага Краю выражае рашучы пратэст супраць закрыцця беларускамоўнай праграмы з Чырвонага касцёла "Голас душы" дырэкцыі Белтэлерадыё.

Гэтая праграма была патрэбна і для людзей Віленшчыны, асабліва сярод пажылых і хворых людзей, якія нямогучы прыходзіць у свой касцёл, слухалі набажэнствы на радыё. Цяпер гэтай магчымасці яны пазбаўлены.


Людзі Віленшчыны лічаць, што закрыццё праграмы "Глолас душы" ёсць працяг наступу бязбожнікаў пасля замены Крыжа Ісуса Хрыста на 5-канцовую Зорку (на гербе) і адмены каталіцкага свята Задушны дзень ("Дзяды") цяперашнімі беларускімі уладамі.

Гэта ёсць парушэнне правоў чалавека, свабоды сумлення з боку ўладных бязбожнікаў.

Наша арганізацыя ТБМ і каталіцкая грамада беларускага касцёла святога Бартламея ў Вільні просяць Бога абразуміць дырэкцыю Белтэлерадыё, якая закрыла праграму "Голас душы" і папярэджваюць гэтых бязбожнікаў за іх адказнасць перад Богам і людзьмі.

Дык дапаможа нам Бог!

Старшыня ТБМ
Ю. Гіль.



ВЕСТКІ З ВІЛЕНШЧЫНЫ

1. 2002 год для ТБМ Віленскага Краю – юбілейны.

25 сакавіка 1992 года ў Дзень Звеставання прыйшла добрая вестка – у Міністэрстве юстыцыі Літвы была ў гэты Дзень зарэгістравана наша Таварыства, якое было ўтворана на Устаноўчым З'ездзе ў траўні 1991 года. Гэтую дату мы па-ранейшаму ў гэты год будзем адзначаць добрымі справамі. Сёлета мы працуем у наступных кірунках:

- працягваем ушаноўваць імя Ф. Багушэвіча;
- ушанаванне памяці Б. Тарашкевіча (у сувязі з 110 угодкамі яго нараджэння);
- вырашаць пытанні кананізацыі беларускіх святароў В. Гадлеўскага і А. Станкевіча;
- мерапрыемствы у "Засцянковай хатцы" (прысвечаныя 10-годдзю дзейнасці ТБМ).

2. Ушанаванне памяці Ф. Багушэвіча працягваецца.

Падрыхтаваны ўсе матэрыялы (дакументы) і здадзены ў Віленскае раённае самакіраванне на разгляд дэпутатаў аб наданні Савічунскай бібліятэцы **імя Францішка Багушэвіча**. Спадзяемся, што на бліжэйшай сэсіі дэпутатаў раёна гэтае пытанне будзе вырашана.

Таксама праз дэпутата Сойма Літвы беларуса Вацлава Станкевіча накіравана Прашэнне ТБМ Віленшчыны на імя пробашча касцёла ў Руйконах Віленскага раёна (тут хрысцілі Ф. Багушэвіча) аб дазволе ўстанавіць на тэрыторыі касцёла яго Мемарыяльную Дошку. Тут напэўна будзе вырашыць пытанне цяжэй, але спадзяёмся на лепшае.

А ў саміх Свіранах (радзіма Ф. Багушэвіча) на будынку прыватнага дома будзе сёлета ўстаноўлена Мемарыяльная Дошка з адпаведным надпісам на беларускай мове лацінкай. Адкрыццё плануецца пад час правядзення ў Савічунах Багушэвічавых чытанняў (першая субота красавіка 2002 г.).

3. Прынята пастанова рады ТБМ Віленскага краю ад 5.12.2001 г. "Аб правядзенні Першых Багушэвічавых чытанняў у 2002 г.", дзе ўказваецца, што ў Савічунах штогод у апошнюю суботу сакавіка м-ца праводзіць Багушэвічавы чытанні і Дзень беларускай паэзіі ў Літве (накшталт таго, як гэта праводзіцца ў Барэйкаўшчыне ў Доме-музеі Сыракомлі У.). Для правядзення такіх мерапрыемстваў ужо створаны ці ствараюцца адпаведныя ўмовы).

У сувязі з тым, што сёлета апошняя субота сакавіка з'яўляецца Вялікай суботай перад Вялікаднем, то правядзенне такога мерапрыемства пераносіцца на наступную суботу, г.зн. першыя Багушэвічавы чытанні адбудуцца 6 красавіка 2002 г. (субота), пачатак у 12-00 у памяшканні Савічунскай бібліятэкі і Літаратурнага музея Ф. Багушэвіча (Віленскі раён, Рукойнская сенюнія, в. Савічуны. Запрашаем на гэтае мерапрыемства дэлегацыю з Менска. Калі ласка, запрашаем у Вільню, на радзіму Ф. Багушэвіча, Свіраны-Савічуны, у Літаратурны Музей і бібліятэку Ф. Багушэвіча на Яго, Багушэвічавы чытанні, якія праводзіць ТБМ Віленскага Краю.

4. Кананізацыя святароў. Гэтага заслугоўваюць і беларускія святары Вінцэнт Гадлеўскі і Адам Станкевіч, якія верна служылі Богу, народу і Бацькаўшчыне і аддалі свае жыцці за веру, каталіцкі касцёл і свой народ...

ТБМ Віленшчыны, каталіцкая грамада беларускага каталіцкага касцёла св. Барталамея ў Вільні лічаць а.а. В. Гадлеўскага і А. Станкевіча сваімі прарокамі і святымі ў справе рэлігійнага і нацыянальнага Адраджэння. Праз дэпутата – беларуса Сейма Літвы Вацлава Станкевіча ў адрас біскупа Гарадзенскай дыяцэзіі а. Аляксандра Кашкевіча накіраваны падрыхтаваныя матэрыялы (дакументы) с просьбай хадатайнічаць перад Папам Рымскім Янам-Паўлам ІІ аб кананізацыі В. Гадлеўскага і А. Станкевіча.

Таксама збіраюцца матэрыялы пра іх дзейнасць, каб у далейшым у парафіяльным Доме касцёла св. Барталамея ў Вільні адкрыць адпаведную экспазіцыю.

У хуткім часе ў польскай газеце "Наш час" будзе надрукаваны мой артыкул пад назовам: "Постаці беларускага рэлігійнага і нацыянальнага адраджэння – Вінцэнт Гадлеўскі і Адам Станкевіч (да пытання іх кананізацыі). Хацелася б каб і на старонках беларускамоўных газет "Наша слова" і "Рунь" з'явіліся адпаведныя артыкулы, што б садзейнічала вырашэнню гэтага пытання.

5. 2002 год – 110 угодкі Браніслава Тарашкевіча.

ТБМ імя Ф. Скарыны Віленскага Краю дамагаецца перад віленскімі раённымі ўладамі аб устанаўленні Мемарыяльнай Дошкі на будынку Лаварышскай СШ, дзе ў свой час вучыўся Б. Тарашкевіч. На гэты конт ёсць Пастановы Рады школы і Рады РайАНА аб устанаўленні гэтай Дошкі, але пакуль што яна на паперы.

Праўда, у Лаварышках адна з вуліц носіць імя Браніслава Тарашкевіча і гэта цешыць, але гэтага мала. Ёсць некаторыя сілы ў раёне (пальшчызна), якія робяць супраціў гэтай справе, спасылаючыся, што Б. Тарашкевіч вёў барацьбу ў свой час з польскімі ўладамі.

Дырэктар Лаварышскай СШ (руска-польскай) Хелена Кеда адмовіла ў тым, каб школа насіла імя Б. Тарашкевіча, а рэдакцыя раённай газеты "Дружба" у каторы раз адмаўляе друкаваць матэрыялы пра Браніслава Тарашкевіча (дарэчы, Віленскі раён называюць польскім, бо там большасць дэпутатаў ад польскай палітычнай арганізацыі і гэтым тлумачыцца цяжкасць у вырашэнні гэтага пытання.

ТБМ Віленшчыны не апускае рукі, працуе ў гэтым кірунку збірае матэрыялы пра Б. Тарашкевіча. Хацелася б мець дапамогу і ад навукоўцаў Менска, у прыватнасці ад А. Ліса, якія б дапамаглі кніжкамі і др. матэрыяламі. Чакаем дапамогі!

6. На канец чэрвеня 2002 года рыхтуецца мерапрыемства на тэму: **"Крыжовы шлях..."**, прысвечаны 10-годдзю ТБМ імя Ф. Скарыны Віленскага Краю, якое будзе праводзіцца на базе "Засцянковай хаткі" у засценку Вашунова Віцебскай вобласці. Гэта будзе напярэдадні рэлігійнага свята ў Будславе, якое адбываецца штогод 2 ліпеня.

Наша Таварыства працуе, жыве, дзейнічае...

7. Барацьба з докшыцкай бюракратыяй працягваецца.

Ужо прайшло шмат часу, як у 1999 годзе быў зроблены бандыцкі напад на "Засцянковаю хатку". Докшыцкія раённыя ўлады і праваахоўныя органы апякуюць гэтых нападнікаў Пракуратурай РБ супраць іх узбуджана крымінальная справа, але пракурор Докшыцкага раёна Байданаў матэрыялы следства не перадае ў суд. Ужо ў каторы раз спыняе справу. Я зноў па гэтым пытанні з'звярнуўся ў Вярхоўны Суд і Пракуратуру Рэспублікі Беларусь. Злачынцы павінны панесці пакаранне.

Старшыня ТБМ Віленшчыны Юры Гіль.
"17" студзень 2002 г.

На гонар руплівцаў беларускай мовы

Урачыстая вечарына 18 студзеня 2002 г. у памяшканні музея Янкі Купалы адбылася чарговая ўрачыстая вечарына грамадска-асветніцкага клуба "Спадчына". Яе мэта палягала галоўным чынам у ганараванні нашых слынных суайчыннікаў рознымі ўзнагародамі за тую дзейнасць, якой яны займаліся і займаюцца дзеля беларускай будучыні. Такіх асобаў на гэты раз было ажно чатыры. Кульмінацыяй вечарыны, як і чакалася, стала віншаванне вельмішаноўнага сябра клуба "Спадчына", вядомага беларускага мастака Яўгена Ціхановіча з ягоным 90-гадовым юбілеем і



Ганаруецца Яўген Ціхановіч

ўшанаванне яго пачэснай і ганаровай узнагародай - бел-чырвона-белай стужкай з выявай Пагоні і з надпісам "Ганец адраджэння". Той унёсак у беларускае выяўленчае мастацтва, які зрабіў за сваё доўгае жыцце юбіляр, заслугоўвае самых лепшых ухвалаў. Але дзе яны ад афіцыйных, дзяржаўных устаноў? Пэўна, наўрад ці дачакаецца іх сціплы і сумленны творца. Ды і ці патрэбна яму іх чакаць? На вечарыне ж, наадварот, сам юбіляр шчодра адорваў сваімі творами іншых, у тым ліку і Таварыства беларускай мовы. Пасля гэтага узнёслага моманту адбыліся і астатнія ганараванні ўзнагародамі, што былі вызначаны клубам "Спадчына". Так, медалём з выявай Язэпа Лёсіка (вядомага беларускага філолага) за служэнне роднаму слову была ўзнагароджана выкладчык матэматыкі, дацэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Людміла Майсеня. У сваім слове ў адказ яна, між іншым, адзначыла такую цікавую і трывалую тэндэнцыю у нашай моладзі як свядомае імкненне да спасціжэння сваёй нацыянальнай адметнасці. Былі прыведзены яскравыя прыклады з яе 10-гадовай практыкі выкладання вышэйшай матэматыкі па-беларуску, што суправаджалася гарачымі воплескамі прысутных.



Прамаўляе Людміла Майсеня

Наступным быў ушанаваны вядомы пісьменнік і даследчык нашай даўніны Арсен Ліс. Яму быў уручаны медаль з выявай Язэпа Драздовіча за надзвычай глыбокае даследванне дзейнасці гэтага выбітнага беларускага мастака і культурніцкага дзеяча пачатку мінулага стагоддзя і за напісанне кнігі "Вечны вандроўнік." Пад шчырыя воплескі была ўручана ганаровая ўзнагарода, ордэн "Гонар Айчыны", мастаку Алесю Цыркунову, сябру клубу "Спадчына" і творчай суполкі "Пагоня". Камітэт па ўшанаванні палічыў яго вартым такой высокай узнагароды за паслядоўную і высокапрафесійную дзейнасць на ніве адраджэння нацыянальнай свядомасці рознымі выяўленчымі мастацкімі сродкамі. На працягу вечарыны колькі сваіх твораў выканалі аўтар-спявак Пятро Русаў і пад акампанемент гітары арыгінальная спявачка Ларыса Жывалеўская. Акрамя гэтага сябрамі клуба "Спадчына" былі абмеркаваны надзённыя пытанні дзейнасці. Найбольш значныя з іх - усталяванне помніка-стэлы "Змагарам за родную мову" ды пытанне аб належным ушанаванні святара-пакутніка ксяндза Вінцэнта Гадлеўскага. Клуб і надалей рыхтуецца праводзіць свае культурна-асветныя мерапрыемствы. Той, хто мае паслужыцца на карысць Бацькаўшчыне, звяртайцеся да старшыні клуба сп. Анатоля Белага (х.т. 235 - 66 - 08, г. Менск).

А. Белчырвонабелы.



Ганаруецца Арсень Ліс

Алесь Грудзіна

ШКЛОЎ У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

"... я табе спад шыбенцы кажу, народзе, што тады толькі зажывеш шчасьліва, калі над табой Маскаля ўжо ня будзе".

Кастусь Каліноўскі.

У жніўні 1772 года знясіленая шматлікімі войнамі, феадальнай анархіяй Рэч Паспалітая стала ахвярай змовы сваіх суседзяў – Аўстрыі, Прусіі і Расіі, якія дамовіліся аб падзеле яе тэрыторыі. Агрэсіўная і дэспатычная Расія захапіла Інфлянцкае ваяводства, большую частку Полацкага ваяводства, амаль усё Віцебскае і ўсё Магілёскае ваяводствы (у тым ліку і Шклоў), а таксама частку Менскага ваяводства. Агульная плошча далучанай да Расійскай Імперыі тэрыторыі дасягала 86 тысяч квадратных кіламетраў, а колькасць насельніцтва перавышала адзін мільён 225 тысяч чалавек.

У мэтах стварэння на далучанай тэрыторыі Беларусі надзейнай сацыяльнай апоры расійскаму самаўладству Кацярына ІІ пачала шырокую раздачу зямель з прыгоннымі сялянамі рускім памешчыкам, найперш з ліку сваіх фаварытаў, вайскоўцаў і буйных чыноўнікаў. Пацягнуліся на новыя ўладанні і тыя, каго абышлі чынам, месцам або ўзнагародай, чыя гаспадарка прыйшла ў заняпад, а па-сапраўднаму працаваць не было ні жадання, ні ўмення. У сваіх успамінах чыноўнік асобых даручэнняў А. Масолаў пісаў, што на правінцыі ўсе гэтыя чыноўнікі адчувалі сябе не вельмі добра, бо вымушаны былі жыць у варожым акружэнні і ад смутку ў асноўным "пілі горкую" і "гулялі ў карты".

Губернская канцылярыя Магілёва, якой кіраваў Васіль Алоеўцаў, стала мекай для авантурыстаў, якія дамагаліся годных месцаў. Алоеўцаў і раздаваў іх, таму яго чыноўнікі "чтили как золотога тельца". Пры ім пасля працы ладзіліся шумныя п'янкі. Нават праваслаўны епіскап Р. Канінскі скардзіўся губернатару М. Кахоўскаму на начныя сходы канцылярыстаў, бо тое "соблазнительно для истинных христиан и душегубно" для неверных.

Падобныя з'явы назіраліся ў той час і ў новых уладальнікаў Шклоўскага маёнтку. Няўмелае кіраўніцтва гаспадаркай прывяло да таго, што знакаміты культурна-эканамічны бум, які назіраўся ў Шклове пры дзейнасці вядомага фаварыта рускай Імператрыцы генерала Семёна Зорыча аказаўся кароткачасовым. Пры гэтым драпежніцкая эксплуатацыя сялян і рамеснікаў Шклоўскага маёнтка прывяла да іх крайняй беднасці. Літаратар А.В. Нікіценка, які наведаў у гэты час Шклоў, у сваім дзённіку зрабіў такі запіс: "Я заходзіў у хаты тутэйшых сялян – што за праца і беднасць. Дзеці брудныя, амаль усе ці пакутуюць хваробамі вачэй, ці балячкамі на твары і на целе. Твары пазбаўлены жывасці, атупелыя, хаця пад гэтай іх маскай хаваюцца розум і хітрасць. Гэтыя людзі відаць пакутуюць ад празмернай беднасці і прыгнёту". Вось чаго каштавала раскошнае жыццё тагачаснага ўладальніка Шклова.

Амаль у аднолькавых умовах апынулася пераважная большасць сялян на новых далучаных землях. Гэта садзейнічала таму, што вясной 1794 года ў Беларусі, Польшчы і Літве выбухнула нацыянальна-вызваленчае паўстанне, кіраўніком якога быў абраны нашчадак старажытнага беларускага роду, генерал Тадэвуш Касцюшка. Першапачаткова яно развівалася паспяхова. 22 красавіка паўстанне перамагло ў Вільні і хутка стала пашырацца на іншыя беларускія гарады і мястэчкі. Касцюшка 7 траўня выдаў "Маніфест", які надзяляў сялян асабістай воляй, прызнаваў за імі права на зямлю, якую яны апрацоўвалі, абмяжоўваў паншчыну. Гэта павярнула да паўстання сялян. Аднак аддзелы дрэнна ўзброеных паўстанцаў не маглі супрацьстаяць рэгулярным рускім войскам, да таго ж і ў кіраўніцтве паўстанцаў было зроблена некалькі стратэгічных памылак. Да восені паўстанне было жорстка задушана, а сам Касцюшка цяжка паранены ўзяты ў палон. Давялося ў хуткім часе слаўтаму беларусу праехаць і вулачкамі тагачаснага Шклова. Па загаду Кацярыны II Касцюшку павезлі ў Пецярбург. Баючыся нападу паўстанцаў маршрут абралі акружны – праз Украіну, потым праз Гомель, Магілёў, Шклоў і далей на Оршу і Віцебск. Невядома, ці адбылася сустрэча ў Шклове Т. Касцюшкі і С. Зорыча. Але калі і адбылася і пазірклі іх сустрэліся, то аб чым былі ў гэты момант іх думкі? Пра гэта можна толькі меркаваць, бо на скрыжаванні гістарычнага лёсу сустрэліся два генералы якія пароэнаму дасягнулі гэтага звання і па-рознаму выканалі сваё прызначэнне на Беларусі. Так рэалізавалася абяцанне рускай царыцы зрабіць далучаныя да Імперыі народы "соучасниками блаженства, славы и величия".

Пасля смерці С. Г. Зорыча імператрыца Марыя Фёдараўна з дазволу свайго мужа Паўла І мела ласку прыняць апеку над маёнткам. У выніку Шклоўскі маёнтак не быў дапушчаны да публічнага продажу і яго спадчыннікам стаў брат Зорыча Давыд Гаўрылавіч Неранчыч. Ён у 1802 годзе атрымаў дазвол далучыць да свайго прозвішча і прозвішча памёршага брата і пісаўся Неранчыч-Зорыч. Яшчэ раней ім асабіста праводзіўся распродаж маёмасці ў тым ліку і артыстаў Шклоўскага тэатра. Менавіта для гэтага ў Шклоў у 1800 годзе быў пасланы І. І. Вальберх, інспектар балета і выкладчык дырэкцыі Імператарскіх тэатраў. Ён выбраў 8 мужчын і 6 жанчын. Усе яны былі прызваны на службу дырэкцыі тэатраў.

Па-рознаму склаўся лёс шклоўскіх артыстаў, але больш за ўсіх праславілася Кацярына Азарэвіч. А праз пэўны час ужо і яе дачцэ Марыі выпадзе першай у расійскай тэатральнай гісторыі выканаць ролю гераіні Лізы ў сцэнічным увасабленні грыбаедаўскага "Гора ад розуму".

Неранчыч-Зорыч рабіў спробу аднавіць частку разбуранага, але сродкі яго былі мізэрныя і, напэўна, чалавек ён быў не вельмі высокага інтэлектуальнага ўзроўню. Пісьменнік Д. І. Фанвізін, які сустракаўся з ім у Парыжы, пісаў, што: "Неранчыч ніколі не браў кнігі ў рукі і ніколі карты з рук не выпускаў".

Між тым гібель Шклова як цэнтра забаў у Беларусі не азначала канчатковага заняпаду горада. Шклоў юрыдычна заставаўся буйнейшым мястэчкам у Магілёўскай губерні. У 1803 годзе ў ім налічвалася 1015 дамоў, дзейнічалі пяць праваслаўных цэркваў, касцёл, тры манастыры, чатыры яўрэйскія малітоўныя дамы, гасцінны двор, вялікая колькасць гандлёвых лавак, будынак уладальніка.

У 1812 годзе Беларусь зноў ператварылася ў арэну жорсткіх бітваў – пачалася Айчынная вайна. Напачатку Шклоўскі маёнтак абмінулі і адыходзячыя рускія войскі, і галоўныя сілы французскай арміі. Толькі 14 (26) ліпеня ў Шклове адбылася невялікая сутычка, аб якой вядома з данясення атамана Данскога войска М. Платава камандуючаму 2-й Рускай арміі генералу П.І.Баграціёну: "Адпраўленыя ад мяне для пошуку каманды, адна ў Шклове... напаўшы на непрыяцеля, секла яго і прагнала праз раку Дняпро, узяўшы ў палон 8 афіцэраў і 72 радавых".

Потым пачаўся час акупацыі. Насельніцтву не было спакою: безупынныя рэквізіцыі, калі выграбалася апошняя жменя зерня, забіраўся апошні жмут сена; напады банд марадзёраў, якія ў вялікай колькасці бадзяліся па навакольных лясах. За час акупацыі толькі шклоўскія яўрэі паставілі для французскага войска пяць тысяч пар абутку і тры тысячы мундзіраў, не лічачы харчоў. Усяго ж за 1812 год шклоўскае яўрэйскае таварыства панесла страт на 200 тысяч рублёў.

Розны быў удзел у гэтай вайне. Сотні мужчын неслі службу ў расійскім войску. Адзін з іх, Раман Рыгоравіч Бекер, былы прыгонны танцор Шклоўскага тэатра, уступіў у апалчэнне. Вызначыўся ў баях на тэрыторыі Беларусі. За ўзяцце Полацка ён становіцца Георгіеўскім кавалерам, у далейшым за храбрасць і мужнасць прызначаецца прапаршчыкам. Сам жа ўладальнік Шклоўскага маёнтка Сямён (Арсені) Паўлавіч Чарнаевіч, да якога мястэчка перайшло ў 1811 годзе пасля смерці Д. Г. Неранчыча-Зорыча, схаваўся з усёй сваёй сям'ёй у глухой вёсцы Рабкі сярод лясоў і балот у Чавускім павеце.

Вызвалены Шклоў ад французаў быў 10 кастрычніка 1812 года аддзелам казакоў на чале з падпалкоўнікам Храпавіцкім з праслаўленага партызанскага злучэння Д. В. Давыдава. А 28 лістапада ў мястэчку Стараселле, сучаснага Шклоўскага раёна, размясціўся са сваёй галоўнай кватэрай галоўнакамандуючы рускай арміі М. І. Кутузаў. Менавіта тут аддаў ён загад аб аперацыях на рацэ Беразіне, дзе быў нанесены знішчальны ўдар па французскай арміі.

Кароткачасовае "гаспадаранне" захопнікаў на Беларусі нанесла вялізную матэрыяльную шкоду яе гаспадарцы. Па няпоўных дадзеных, чатырохмесячнае знаходжанне французаў у Магілёўскай губерні абышлося яе насельніцтву ў 33,5 мільёнаў рублёў. У выніку эпідэміі, голаду і вайны рэзка скарацілася насельніцтва губерні: з 401056 чалавек у 1812 годзе (да нашэсця Напалеона) да 320404 чалавек у 1817 годзе, або за пяць гадоў зменшылася на 21 працэнт.

Але нягледзячы на нягоды, якія выпалі на долю жыхароў Шклоўшчыны, яны змаглі ў кароткі тэрмін аднавіць эканоміку мястэчка. Пасля вайны ўсё большае значэнне стаў набываць гандаль купцоў Магілёўскай губерні з Украінай, на чым асабліва хутка разбагацелі шклоўскія купцы. Яны займаліся скупкай у губернях Украіны хлеба – жыта, пшаніцы, аўсу, рознага роду круп і солі. Завозілі тавары па Дняпры ў Шклоў на караблях (берлінах). Сюды з'язжаліся гандляры і прамыславікі для куплі тавару, які ўжо сухім шляхам ішоў у Смаленскую, Віцебскую, Менскую губерні. Значная частка хлеба адвозілася ў горад Рыгу. За год на Шклоўскую прыстань прычальвала да 1000 берлін, яны разгружаліся, а прывезены тавар захоўваўся ў спецыяльных двух і трохпавярховых свіранах, колькасць якіх даходзіла да 150. Разгрузачныя работы выконвалі штодня каля 500 чалавек і 1200 падвод для транспартавання. У свірнах знаходзілася хлеба на 5 мільёнаў рублёў і солі – на адзін мільён рублёў. У росквіце (1815-1825 г.г.) штогадовы тавараразварот дасягаў 50 мільёнаў рублёў.

Малюнак таго, што ўяўляў Шклоў у той час, можна атрымаць на падставе рапарта магілёўскаму, віцебскаму і смаленскаму генерал-губернатару аб неабходнасці асобага ўладкавання вызначэння ў паліцэйскім парадку за 1829 год. У той час Шклоў складаўся з чатырох частак, - Новашклоўскай, Старашклоўскай, Рыжкаўскай і Задняпроўскай, раздзеленых на 12 кварталаў. Мястэчка, а менавіта гэта назва ў 1818 годзе канчаткова вызначыла ролю Шклова ў адміністрацыйнай сістэме, мела чатыры ўезды, рынак, адну паштовую, чатыры купецкіх і прасёлкавых дарогу, карабельную прыстань, пераправу праз Днепр і тры масты. Сярод забудоў вылучаліся пяць цэркваў, два рымска-каталіцкія касцёлы, 16 мураваных будынкаў, а таксама 30 заезджых дамоў, два трактыры і 1550 дамоў, 200 лавак і 20 "лабазаў". Большую частку насельніцтва складалі яўрэі – 8600 з 10610 чалавек.

Але з часам сацыяльна-эканамічны ўзровень і агульнае значэнне Шклова пачынаюць падаць. Таму садзейнічалі розныя прычыны.

У 1831 годзе Беларусь падтрымала антырасійскае паўстанне, якое пачалося ў Польшчы. Радыкальная частка шляхецкіх рэвалюцыянераў выступала як за нацыянальнае вызваленне, так і за надзяленне сялян зямлёй з выплатай страт памешчыкам, за сумесную з расійскім народам вызваленчую вайну з царызмам пад лозунгам "За нашу і вашу свабоду". Пасля яго задушэння пачаліся рэпрэсіі, рускім царызмам быў узяты курс на паслядоўную русіфікацыю краю. У афіцыйных дакументах было забаронена выкарыстоўваць назвы "Беларусь" і "Літва", а замест іх уводзілася назва "Северо-Западный край". Былі зачынены Віленскі універсітэт, яшчэ раней – у 1820 годзе, як "неблагонадёжный" – Полацкі універсітэт, іншыя навучальныя установы. Узмацніўся наступ супраць уніяцкай царквы і каталіцкага касцёла. Гэта акцыя суправаджалася спальваннем рэлігійных і вучэбных кніг, мноства з якіх былі беларускамоўныя. Менавіта такі лёс напаткаў Шклоўскі дамініканскі манастыр, заснаваны Аляксандрам Хадкевічам яшчэ ў пачатку 17 стагоддзя.

Акрамя палітычных, заняпаду Шклова паспрыяла і шэраг эканамічных прычын. Па меры таго, як па Расіі раскідвалася сетка чугункі і ў сувязі з адтокам грузаў на Пінскую і Бабрысаўскую прыстані, у Шклове пачаў падаць хлебны і саляны гандаль. Да 1860 году з паўднёвых губерняў прывозілася хлеба толькі на 328 тысяч і солі на 40 тысяч рублёў, а колькасць свірнаў мелася на прыстані 25, і тыя былі напалову разбураны. Адыграла ролю і тое, што новая Санкт-Пецярбургская дарога праходзіла ў баку ад яго. У пачатку 1836 года члены Шклоўскага кагала звярнуліся з просьбай у Міністэрства унутраных спраў аб накіраванні лініі па старому тракту праз Шклоў. Але на гэта атрымалі адмоўны адказ.

У пэўнай ступені заняпад звязаны і са зменай ў кіраванні мястэчкам. У 1826 годзе, пакінуўшы вялізныя даўгі, памёр апошні з асназасобных уладальнікаў Шклоўскага маёнтка і родзічаў С. Зорыча вянгерскі дваранін С.П.Чарнаевіч. Па распараджэнню ўрада маёнтак быў аддадзены ў догляд дваранскай апецы і затым перайшоў да розных уладальнікаў. Так, тры часткі – Новашклоўская, Рыжкаўская і Задняпроўская перайшлі ў традыцыю да палкоўніка барона Саргера. Для пагашэння даўгоў С.П. Чарнаевіча Губернскае Кіраванне неаднаразова звярталася ў Кіраўнічы Сенат з просьбай аб продажы маёнтка з публічных таргоў. Аднак у сенацкім указе ад 31 сакавіка 1838 года паведамлялася, што продаж немагчымы і таму задавальненне даўгоў павінны рабіцца з фондаў маёнтка, які паступае ў адміністратыўнае губернскае кіраванне, сучасным жа ўладальнікам маёнтка "обращение доходов в свою пользу воспретить". Частка маёнтка, свабодная ад традыцыі, была ўзята ў адміністрацыю. У 1842 годзе сенат выканаў просьбу ўладальнікаў Шклова аб вызначэнні для іх часткі даходаў, якія паступалі ў Губернскае Кіраванне. З той часткі даходаў, якія знаходзіліся ў адміністрацыі, ім выдзялялася штогод чацвёртая частка.

(Працяг у наступным нумары.)



Да 60-годдзя Міхася Ткачова

"ГРУНВАЛЬД" – ПАРОЛЬ СВАБОДЫ

Гістарычны нарыс

(З сямейнага архіву. Паводле зборніка "Паходня". Менск.1994 г.)

... Ноч з 14-га на 15-е ліпеня 1410 г. была цёмная і бурлівая. Прайшла жахлівая навальніца з праліўным дажджом. Хмары несліся па небе, то засланяючы, то прачышчаючы серп навароджанага маладзіка. Віхура зрывала намёты, шкуматала абозныя фуры, круціла дым і попел сіпеўшых, залітых вадою агнішчаў. Асабліва начная нячыстая сіла прайшлася па лагеры крыжакоў, дзе некалькі шатроў вырвала з каламі, зашпурнула на высокае дрэва. Раніцай яны недарэчнымі сцягамі гойдаліся на разлапістых галінах як сведкі неўтаймаваных начных жарсцяў прыроды.

Над Вітаўтавым лагерам нібы сам Бог распрасцёр сваю ахоўную дзясніцу. Бура сюды не даляцела, і толькі дождж прайшоўся па паходных намётах, загнаўшы пад вазы тых, хто спаў, раскінуўшы рукі, на пасцілках, проста на зямлі...

Раніцай адзін відушчы старац, які прыцягнуўся з абозам Вітаўта, расказваў воінам і шчыра бажыўся, што бачыў, як на Месяцы ў час навальніцы люта біліся кароль і манах. Кароль урэшце падужаў і скінуў манаха з Месяца долу. Маладыя, першы раз пры мячы, дружыннікі, вытарашчыўшы вочы і раззявіўшы рот, слухалі дзедаўскі аповед. Старыя ж спакойна пасміхаліся ў вусы, правяралі зброю, перамігваліся. Яны ведалі, што гэта работа мсціслаўскага пратапопа Лукі. Ён, каб прыўзняць настрой маладых воінаў перад бітвай, якая будзе для многіх першай і апошняй сечай, падаслаў свайго каліку-перахожага. Старац гэты неадступна хадзіў з мсціслаўскай харугвай ва ўсе паходы князя Лугвеня-Сямёна і рабіў сваю няхітрую, але патрэбную і карысную справу – падбадзёрваў людзей.

Князь прайшоў па абозе сваёй харугвы і, паклікаўшы Луку, сказаў:

- Давай, ойча, адпускай ратнікам грахі. Адслужы малебен, умацуй дух і веру воінаў. Чуе мая душа --хутка пачнецца малацьба...

Пачуўшы пра малебен, воіны сталі тушыць вогнішчы, проста ля вазоў апраналі чыстыя, белыя палатняныя кашулі – на бой як на свята і на смерць! – аблачаліся ў кальчугі, калантары, зброі бляховыя, прылбіцы скурковыя і жалезныя. Твары суровелі на вачах. Яны на каленях выслухалі малітву і настаўленне Лукі. Пачалося адпусканне грахоў. Быў у Лугвеня і яшчэ адзін клопат: у мсціслаўскім палку ля сцяга будзе стаяць яго родны сын Юры. Не хацеў ён яго браць з сабою ў паход, рана яшчэ, толькі 13-я вясна за плячыма, дзіцё. Але сын так прасіўся, так угаворвалі Лугвеня яго дружыннікі, якія абяцалі пільнаваць сына, як вока ў ілбе, што князь здаўся. І вось цяпер даручыў дзядзькам-мсціслаўцам слова сваё спраўдзіць.

Тым часам дождж зноў пачаў накрапваць, але ж неба праяснілася і пераможна заззяла сонца.

Усё войска Вітаўта і Ягайлы зшыхтавалася ў тры лініі, ад чаго паміж імі ўтварыліся два калідоры – "вуліцы". Па іх насіўся на кані Вітаўт, падраўноўваючы сваіх вояроў і вышыхтоўваючы іх у кліны. На пярэдняй вузкай лініі кожнага кліна стаялі лепшыя воіны, т.зв. "падхарунжыя", бо за імі размяшчаліся сцяганосцы. Сонца і вецер на вачах зрабілі з воінаў цуд: даспехі і шоламы, наканечнікі дзідаў то ільдзівіста свяціліся, то ўспыхвалі яркімі блікамі і тады хацелася прыжмурыць вочы ад іх нясцерпна зыркіх промняў. Рознакалёрныя плашчы-накідкі расквечвалі шыхт конных віцязяў, ігралі, пераступаючы і танцуючы, жарабцы-стаеннікі. Коні іржалі, прысядаючы, спрабавалі даць дыбкі, але цяжкая рука і шпоры-астрогі хутка ўтаймоўвалі іх маладую кроў. Над галовамі харунжых ірваліся з рук ад напору ветру палатніны сцягоў. Вітаўт іх ведаў на памяць: вось той з ярка-жоўтага шоўку-кітайкі з белай пагоняй на чырвоным полі – мсціслаўцы з князем Сямёнам. Вось тая залёна-мурожная харугва – віцебская. Далей жоўта-чорная (жыццё і смерць) – храбрых палачан. А вось кармазынавая – гарадзенская, а далей – валашковая – з Бярэсця... Герб "Пагоня" лунаў над Вітаўтавымі шыхтамі і будзіў у душы князя цвёрдасць духу і веру ў пераадоленне сёння, тут, клятых "братоў-хрысціян".

Ягайла яшчэ маліўся ў сваёй капліцы-намёце, калі прыйшлі першыя звесткі аб тым, што крыжакі рушылі. Выцягнуўшыся ў адну лінію на некалькі кіламетраў, шыхт рыцараў спыніўся. Так абодва войскі стаялі да палудня. Тады вялікі магістр Ульрых фон Юнінген па парадзе герольдаў, як выклік на бітву, адправіў Вітаўту і Ягайлу два мячы. Герольды, прыведзеныя да Ягайлы, звярнуліся да яго с такімі словамі:

- Гаспадар! Магістр пасылае табе гэты меч, а другі меч мы павінны перадаць брату тваіму, Вітаўту, якога мы хочам убачыць асабіста.

Хутка з'явіўся Вітаўт, якому таксама быў уручаны меч. Той моўчкі ўзяў яго ў рукі, паспрабаваў вастрыню і пільна зірнуў герольду ў вочы. Той позірка не адвёў і ўрачыста мовіў:

- Вялікія гаспадары! Магістр і маршал пасылаюць вам гэтыя мячы ў дапамогу і запрашоўваюць на бітву, і просяць вас, каб вы або самі выбралі месца для бітвы ці аддалі гэта права ім самім. Навошта сядзіце у лесе, калі бітва ўсё роўна непазбежна.

Ягайла і Вітаўт на гэта горда адказалі:

- Мячы прымаем! І біцца гатовы, выбар жа месца адаем у рукі Бога!

Ягайла гаворыць пароль: "Вільня" – "Кракаў" і пасылае прыдворных рыцараў з гэтым паролем да камандзіраў усіх харугваў. Гэта – сігнал выступаць. Для таго, каб у гарачцы бою адрозніць сваіх воінаў ад чужынцаў, загадана ўсім прывязаць да правага пляча пучкі саломы. Кароль пачаў пасвячаць у рыцары маладых вояў і паспеў ашчаслівіць больш 1000 чалавек, калі раздаўся залп нямецкіх гармат – бітва пачалася. Але пачалася яна незвычайна. Адзін з наёмных чэшскіх аддзелаў, уражаны сілай крыжакоў, пакінуў войска Ягайлы і перабег да рыцараў Конрада фон Юнінгена. Аднак вялікі магістр сказаў начальніку чэхаў:

- Я не Хрыстос і мне не патрэбны Іуда!

Аддзел, раззлаваўшыся, вярнуўся да Ягайлы, які загадаў перабежчыкаў не чапаць, адклаўшы суд на потым.

Маладыя рыцары Вітаўта гарачылі коней, падымалі на дыбкі, насіліся перад строем баявых сяброў, надаючы сабе смеласці, а ворагу – страху. Ад конскіх скачак узняўся пыл, ды раптам пырснуў невялікі дождж, які прыемна астудзіў гарачыя твары і абмыў даспехі Вітаўтавага рыцарства.

Вітаўт даў сігнал: зайгралі сурмы, загрымелі сігнал атакі бубяністыя дабышы, ударыўшы ў бубны-катлы. Войска ўраз выдыхнуўшы: "Багародзіца! Памагай!" – рушыла сталёвай шчэццю дзіданосцаў. Аднак, ломячы лінію атакі, з левага і правага флангаў Вітаўтавага войска вырвалася конніца: злева – старшага гетмана князя з Падоліі Івана Жэдзявіда, стрыечнага брата Вітаўта, справа – дворнага гетмана Яна Гаштольда. За імі, з крыкамі "Алах, алах!" паляцелі татарскія харугвы і той-сёй з чэхаў.

Вітаўт з радасцю ў вачах пазіраў за імклівым лётам коннікаў і раптам убачыў са свайго пагорка, як коннікі адзін за другім, а то і групамі сталі знікаць з відавоку. Быццам нябачная нячыстая сіла змятала іх з даліны або глытала ў нейкую прорву.

- Воўчыя ямы! – апякала чало маланкавая думка. – Воўчыя ямы... - Вітаўт з роспачу і крыўдаю, найперш на сябе: "Не ўтрымаў! Не разведаў!", а потым на тых, хто так, аказалася, бяздумна паляцеў на ворага, глядзеў, як набіваліся ў нябачныя адсюль і пэўна добра замаскаваныя пасткі і вішчэўшыя і храпеўшыя ўзбітыя на вострыя калы гарачыя коні. Чуў, як крычалі няшчасныя вояры, пасаджаныя на палі, з пераломанымі хрыбтамі, нагамі, рукамі. "Прымі, Госпадзі, тваіх рабоў і супакой іхныя душы", - перажанаўшыся, прамовіў пра сябе Вітаўт. Ён загадаў падаць сурмамі сігнал: "Войску спыніцца!"

Прушаны шыхт сваёй раці князь абляцеў умомант. Праносячыся перад воямі, ён з непакоем глядзеў на твары людзей, сустракаўся вачамі з падхаружнымі. З радасцю адзначыў, што разгубленых і напалоханых твараў не было.

- Стаяць, стаяць! – камандаваў Вітаўт. – Няхай крыжакі спускаюцца да нас у даліну. Тут сустрэнем і прывецім, чым Бог паслаў! – І ён стралою панёсся на вяршыню пагорка.

Крыжацкая рацць, не вытрымаўшы стаяння войска супраціўніка, пачала спускацца з пагорка. Яна рассеклася на некалькі груп, якія абцякалі воўчыя ямы, абламаўшы лінію атакі. Прычакаўшы зручнага моманту, Вітаўт рушыў свае шыхты.

Першае сутыкненне было імклівым, страшным, засцервянелым крыкам. Палачане крычалі: "За святую Сафію!" Віцебскія дзядзькі – "За добрае Дабравешчанне!" Менчукі з заслаўскімі парубкамі – "За найсвяцейшую дзеву Марыю!"

Першы ўдар быў нанесены дзідамі. Калі яны паламаліся, узяліся за мячы, булавы, цапы і сякеры. Па ўсяму фронту Вітаўтавага войска разгарэлася страшная сеча.

Здаецца, не надоўга Вялікі князь спусціўся з пагорка, як прапусціў момант, калі немцы раптоўна нанеслі з засады удар сваім конным рэзервам. Па гуку бітвы, па яе страшнай мове з мычаннем, іржаннем, перадсмяротнымі крыкамі ён зразумеў, што адбылося нешта благое і непажаданае. Узляцеў на свой камандны пагорак – так і ёсць! Карціна на полі рэзка змянілася. Конная жалезная сцяна спачатку затрымала яго пехацінцаў і рэдкія групы вершнікаў, а потым адкінула назад... пагнала, высякаючы ззаду цяпер ужо нястрашную і лёгкую здабычу. Толькі на самым правым фланзе ўтварыўся вірыючы кацёл, дзе ішла сеча да апошняга, на смерць. Гэта білася групоўка мсціслаўскага князя Сямёна-Лугвеня – мсціслаўцы з аршанскім і смаленскім палкам. Мсціслаўцы стаялі да апошняга, баронячы не толькі сябе, але і юнага князя Юрыя, сына Сямёнава. На радасць Вітаўта ўцекачы з яго войска ўляцелі ў свой табар і з-за вазоў пачалі даваць крыжакам цесны адпор. Адступленне спынілася. Але рыцары пераацанілі свой поспех. Пакуль яны спявалі гімн "Хрыстос, уваскрос...", Вітаўт кінуў Лугвеню Мсціслаўскаму дапамогу, а потым падаспелі і польскія конныя гуфы. Хутка з немцамі на правым крыле было пакончана.

Тым часам з воўчых ям сталі даставаць уцалелых і пакалечаных вояроў. Прынеслі Івана Жэдзявіда з паламанай нагой і найвышэйшага гетмана Ягайлы пана Сокала Чэха. Стары рубака Жэдзявід плакаў ад злосці і крыўды, што так недарэчна трапіў на хітрасць немцаў і выбыў з бітвы. У пана Сокала былі прабіты грудзі. Кроў пухірылася на вуснах, твар на вачах бляднеў і ён хутка адышоў у райскія нябесныя сады. Князя ж Івана паклалі на палатняныя конныя насілкі і адправілі ў абоз, дзе ён, аднак, хутка сканаў, бо яго дрэнна агледзелі і не знайшлі смяртэльную рану ў баку.

Пасля гэтага пагрому, які ўчыніў Вітаўт, галоўныя падзеі разгарнуліся ў бітве Ягайлавага войска з астатнімі сіламі Ордэна. Бой цягнуўся некалькі гадзін. Каля пяці гадзін вечара праціўнік стаў паддавацца і паварочваць у бок свайго абозу. У гэты крытычны момант вялікі магістр сам узначаліў 15 рэзервовых харугваў і пасрабаваў схіліць няўстойлівае ваеннае шчасце на свой бок. Доўга лёс варажыў аднаму і другому боку, але ўрэшце войска Ягайлы і Вітаўта стала адужваць. Яно ўтварыла яму жалезны крывавы "кацёл" і дабівала раз'ятранага звера, калі ўжо промні ападаўшага сонца абвясцілі канец гарачаму дню. Сам вялікі магістр Ульрых фон Юнінген паў ад рукі татарскага хана Багардзіна, які баявой сякерай паставіў апошнюю кропку ў хроніцы жыцця "брата Ульрыха"... Многія яго паплечнікі-дваране і простыя воіны-кнехты кінулі зброю і здаліся ў палон. Частка конных рыцараў вырвалася з акружэння, і іх пагнала ў глыб Ордэнскіх зямель лёгкая конніца саюзнікаў. Толькі ліпеньская цемра ўратавала тых, каму суджана было жыць далей...

... Назаўтра, з першымі промнямі сонца на полі брані пачалі рахаваць плён крывавай працы: зносілі ў табары пад дагляд і апёку манахаў параненых, збіралі сваю і чужую зброю (кожны меў права ўзяць сабе тое, што хацеў – трафеі!). Капалі дол і складалі ў братнія скудзельніцы забітых сяброў, таварышаў, знаёмых і проста радню, землякоў. Курыўся ладан кадзіла паходнай капліцы. Святары адпявалі загінуўшых. Мсціслаўцы хавалі сваіх у двух вялікіх магілах. Перад адной на каленях стаяў юны князь Юры і плакаў. У магіле зверху ляжаў яго дваровы дзядзька Іван Маскевіч, з вёскі Пустынкі. Там Юры праходзіў з маленства "дзядзькаванне": вучыўся араць, сеяць, касіць, хадзіць на паляванне, рос з дзецьмі дзядзькі Івана, насіў, як і ўсе, доўгую і простую палатняную адзежу. Такая тады была традыцыя. У 12 гадоў залічалі ў падлеткі: вялікая прасторная хата дзядзькі Івана здавалася Юрыю больш утульнай, цёплай, роднай, і таму ў княскім цераме на Замкавай гары моцна тужыў па Пустынках і ўсё пазіраў з гарадской сцяны туды, за рэчку, на смалатарню, ад якой да Пустынак рукой падаць...

І вось дзядзькі Івана няма! Ён засланіў сабой маладога князя ў ракавую хвіліну, калі немцы прасеклі ў шыхце мсціслаўцаў ход да іхняга сцяга і гатовы былі праверыць мячамі бліскучыя даспехі Юрыя. Меч рыцара слізгануў па яго шоламе і ўрэзаўся ў неабароненую шыю.

Да рэшткаў мсціслаўскай харугвы, што зшыхтавалася ля братніх магіл, падышлі князь Сямён-Лугвень і Вітаўт.

- Ну вось і мае людзі, - стомлена сказаў Лугвень і азірнуў шыхт. Рэдка каторы з воінаў быў непаранены: у каго рука, у каго чало ці плячо бялелі белым кужалем павязкі. На тварах ва ўсім абліччы воінаў былі бачныя сляды іхняй бязмернай цяжкай ратнай працы.

- Мала ж вас засталося, воі, - прамовіў Вітаўт. – Адны недасекі...

- А нас ніхто і ніколі не высякае, - адазваўся адзін з моцных дзядзькаў. – Такія мы – мсціслаўцы, нязводныя.

Вітаўт усміхнуўся і паківаў галавой:

- Дай жа, Бог... цяпер і навекі...

- А гэта мой сын, - падняў з калень Юрыя Лугвень. – Атрымаў першае хрышчэнне мячом. Уцалеў, але іншыя за яго паляглі... Чатырнаццаты гадок яму.

- А я таксама трох добра параніў, - раптам адказаў княжыч. – А аднаго, казалі людзі, што і ўлажыў, з лука.

- Ну, калі ўсё так, як ты гаворыш, то быць табе знатным ваяром. Як будзеш жаніцца – не забудзь Вялікага князя гукнуць на вяселле. Я такі – прыеду...

І паляпаўшы па плячуку Юрыя, Вітаўт рушыў далей. Войска пераможцаў рыхтавалася да параду. Сонца ўзнялося на паўдзённую вышыню...

Міхась Ткачоў.

Працяг дыскусіі

Нацыянальны рок як супрацьвага самавынішчэнню

З цікавасцю прачытаў 14 лістапада 2001 года ў "Нашым слове" артыкул свайго калегі Анатоля Мяльгуя "Беларускі рок – культурны фяномен у несвабодным грамадстве", з якім мне выпала шчасце разам быць адрынутым Беларускім калегіюмам. Газетная публікацыя апынулася нават лепшай за лекцыю ў тым калегіюме хаця б праз тое, што асабіста я чытаў яе некалькі разоў і ўсё адкрываў новыя нюансы разгляданай праблемы – уплывы мовы на далёкія ад лінгвістычных сферы культуры. Напрыклад музыку.

У рэшце рэшт у маёй свядомасці пачалі выкрышталізоўвацца аспекты, якія мімаволі абмінуў А. Мяльгуй (а мо проста вырашыў абмежавацца, сканцэнтравацца лакальна на беларускім кантэксце). А мне вось прыгадаўся міжнародны аспект праблемы. Многія здаўна лічаць, што рок-музыка можа быць толькі англамоўнай. У прыклад прыводзіцца нямецкі "Sccepion", шведская "ABBA", галандскі "Shocking-blue"…

На жаль, не кожнаму дадзена магчымасць аб'ектыўнай ацэнкі, але калі я бываў у Нямеччыне, заўважыў, што там ніколі не бывае праблем трапіць на канцэрт тых "Sccepion",а вось нямецкія выканаўцы, імёны якіх мы нават і не ведаем, зрываюць татальныя аншлагі. У Мюнхене я нават трапіў на канцэрт славутай аўстралійскай каманды "Midnightoil", а вось на нейкага Штуцэргайзера не змог. Парадокс?

Шмат што растлумачылі мне нядаўнія гастролі па Беларусі галандскага метал-гурта "Thikd Stowe". Мне асабіста выпаў шанц і прымаць удзел у жывым эфіры з гэтымі англамоўнымі галандцамі на радыё "Мір", і самому браць у іх інтэрвію. Яны наадварот казалі, што рок на галандскай мове існуе, але гэта чыста камерцыйныя праекты, а мы, маўляў, авангардысты, ідзем у той незалежнай плыні, якую самі слухаем.

Яны, праўда, заўважылі, што ў Беларусі, ім на дзіва, усё наадварот: увесь альтэрнатыўны авангард трымаецца за нацыянальныя карані, і яны самі вельмі рады былі падтрымаць "гэтых цудоўных авангардыстаў" сваім беларускамоўным уступам для кампакт-дыска "Hakd Life-Heavy Music" (2001, "БМAgroup).

Прызнацца, я асабіста яшчэ з 70-х гадоў захоплены рок-музыкай Галандыі, паказваў ім рарытэты сваёй калекцыі – кампактдыскі гуртоў "Livinq blucs", "Shockinq bluc", "Ekseption", "Golden Earing". Якое ж было дзіва для мяне, што гэтыя англамоўныя гурты, папулярныя ва ўсім свеце, зусім невядомыя новым англамоўным галандцам (толькі адзін з іх трошкі прыгадаў "Golden Earing", але не назваў сярод сваіх куміраў).

Відаць, нават выдатныя музыканты, якія праз чужую мову выпалі з кантэксту сваёй культуры, не патрэбныя ні на радзіме, якая не хоча буць культурнай калоніяй, ні ў мітраполіях англамоўнага року, дзе яны заўсёды будуць глухой правінцыяй.

Прыгадваю і бліскучых айчынных музыкантаў з гуртоў "Форпост", "Инспектор", "Архив"… Штосьці нават не згадваюць пра іх людзі, забыла прэса, хоць адзін з гітарыстаў (Аркадзь Юшын) дамогся нават выгадных кантрактаў у ЗША, другі (Віктар Смольскі) грае ў нямецкім супергурце "Rage". Выходзіць, раз свет не прыгадвае аб Беларусі ў іхнім кантэксце, дык і Беларусь адказвае тым жа. У гэтым сэнсе Беларусь ні чым не адрозніваецца ад Галандыі. Легендамі культуры ўсюды становяцца не зухаватыя рамеснікі, а адданыя сыны.

Часам мае калегі выказваюць мне свой подзіў: "Чаму ты вечна пішаш пра нейкіх невядомых і не падтрыманых прэсай, а праз гады менавіта твае героі застаюцца ў памяці? Ты што, Настрадамус нейкі? І адказ мой звычайна простым: я аналізую культурны кантэкст, а не экзамены ў рамесніках прымаю.

А прэса чамусьці сапраўды вельмі шырокім фронтам аналізуе рамесніцкія паказчыкі, прыходзячы часам да абсурдных высноваў: рок павінен гучаць на мове, дзе нарадзіўся. Нібыта намёк на ангельшчыну, але чамусьці забываецца, што ад пачатку складнікамі новай рокавай субкультуры ў 50-х гадох мінулага стагоддзя сталі і традыцыі афраамерыканскага музыцыравання, і ірландскага, а потым і індыйскага.

Чаму вы, пісакі, забываеце пра цэлыя магутныя плыні як Latin rock, Neue deutsche Welle, polish wave? Менавіта дзякуючы традыцыям NDW, напрыклад, сёння ўсе сусветныя гіт-парады захапілі нямецкамоўныя немцы "Lacrimosa", "Rammstein". Яны ўпісваюцца і ў сусветны кантэкст, і ў свой, нямецкі. І на радзіме іх будуць памятаць, нават калі свет забудзе.

Але вось англамоўныя галандцы (ангельшчына якіх яўна кульгае болей, чым нелюбасная мова Лявона Вольскага з ягоным "венцэй нічого я не патшэбую" замест "венцэй ніц") выпадкова абмаўляюцца, што мараць, каб свет размаўляў на адной мове, і вось ужо двухмоўная газета "Беларуская маладзёжная" кідае камень у мой агарод: "Чуў бы іх Вітаўт Мартыненка, бо яны ж мелі на ўвазе не беларускую мову" ("БМ" № 46 за 7.12.01).

Чаму радуецеся, дурненькія? Ды чуў я гэтых простых галандскіх хлапцоў, якія ў адрозненне ад вас, размаўляюць паміжсобку ўсё ж на роднай мове, хоць і не чыталі нашага Караткевіча, які сказаў пра родную мову пераканаўча:

Яе разам з матчынай цыцкаю
Даў табе ў твае вусны Бог.
Пі. І ведай: гіне ў праклящах
І з дзярма навек не ўстае
Той, хто выплюнуў цыцку маці
Або злосна ўкусіў яе.

Чула б гэтыя словы Насця Пятроўская ды іншыя двухмоўныя "тусоўшчыкі" газеты "Беларуская маладзёжная",мо і паўсталі б з дзярма ды пачыталі б іншую сусветную аўтарытэтную кніжыцу пра адну мову для ўсіх – "Джордж Оруэл" (1984).

Там акурат пра тую мову, на якой выдаецца ваша газета – называецца Newspeak. Ні рускай, ні беларускай. Ніякай. Словы ***"зараз"*** і ***"цяпер"*** не можаце адрозніць. Ні беларусу адчуць прыгажосць роднага, ні чужынцу падзівіцца. Нават імя сабе для беларускага тэксту прыдумалі не беларускае, а сплюшчанае рускае – ***"тусоўшчыкі"***. Мо родных ***"хаўруснікаў"*** саромеецеся? Дык не лезьце з такім нябогім комплексам уласнай непаўнавартасці тлумачыць філасофскія вобразы Вавілонскай вежы. У вас у галаве і ў вашай газеце - Вавілонская вежа, бо зняважылі тое, што даў Бог (кожнаму сваё), а палезлі ў агульную сусветную кучу.

Калі культурныя людзі збіраюцца на ўрачыстае застолле, усе ведаюць, што потым кожнаму давядзецца (паеўшы ды папіўшы) наведаць прыбіральню, але штаноў за сталом ніхто не здымае. Вы ж, двухмоўныя, заклікаеце на свяце сусветных культур адразу скінуць вопратку душы. Каб не абпэцкацца на Вавілонскай вежы, якую вы сабе ў сваёй газеце ўжо збудавалі, намагаючыся "перадолець наступствы будаваных Вавілонскай вежы"? ("БМ" № 46, 2001).

Парадокс? Не! Проста філасофскае адзінства супрацьлегласцяў: хто гучна кліча да адмоўнага дабра, той заўвядзе ўсіх у балота невуцтва, калі з адной мовы на розных полюсах планеты усё адно пачнуць выкрышталізоўвацца розныя традыцыі, розныя мовы, розныя культуры, і свет будзе такім, якім ёсць. Толькі нас там ужо не будзе. І гэта будзе ўжо зусім іншая гісторыя – гісторыя супольнасці, якая нарэшце перастане вынішчаць сама сябе, адмаўляючыся спачатку ад багацця культурнага, потым расавага, потым полавага, потым узроставага.

Вітаўт Мартыненка.

Юбілей хору "Бацькаўшчына"

У снежні 2001 г. споўнілася 10 гадоў хору "Бацькаўшчына" з Горадні пад кіраўніцтвам спадарыні Веры Кунцэвіч. Адметнасць гэтага хору палягае на тым, што яго рэпертуар складаецца з лепшых твораў беларускай духоўнай музыкі ХVII-ХХ ст. незалежна ад канфесійнай прыналежнасці. Так склалася наша гісторыя і наша культура, што цэлы пласт беларускай музыкі "выпаў" з поля зроку музыкантаў, гэтыя творы амаль не гучалі па-за сценамі храмаў і, тым больш, не гучалі разам у адных канцэртах.

Першыя ж выступленні хору былі сустрэты слухачамі з вялікай цікавасцю. Паспяховымі былі ўсе канцэрты хору па гарадах Беларусі, з захапленнем іх прымалі слухачы Даніі, Францыі, Польшчы.

У 1992-94 г.г. хор "Бацькаўшчына" спяваў кожную нядзелю ў Фарным касцёле Горадні пад час беларускай імшы, куды збіраліся не толькі каталікі, але і праваслаўныя, каб паслухаць прыгожыя спевы, беларускае слова.

Высокі прафесійны ўзровень выканання харам духоўнай музыкі быў адзначаны І месцам, якое хор "Бацькаўшчына" атрымаў на фестывалі духоўнай музыкі "Магутны Божа" ў Магілёве ў 1996 г. 10 студзеня 2002 г. у Гарадзенскім гарадскім доме культуры сабралася поўная зала ўдзячных слухачоў і сяброў хору, каб павіншаваць іх з юбілеем. Пасля працяглых апладысментаў, якімі гледачы сустракалі кожны твор, беларускія калядкі ды іншыя творы, павіншаваць юбіляраў выходзілі на сцэну народныя ансамблі "Нёман" і "Гасцінец", гарадзенскія мастакі, літаратары, навукоўцы, музыкі, прадстаўнікі ТБМ Гарадзеншчыны і іншых дэмакратычных няўрадавых арганізацый, сябры, прыхільнікі, спонсары.

А напрыканцы на сцэну вынеслі вялізны торт са свечкамі, якога, пэўна, хапіла, каб даць асалоду не толькі ўсім удзельнікам хору, але і іх сваякам.

Ніна Канунікава.

Выстава выяўленчых студый

У берасцейскім музеі "Выратаваныя каштоўнасці" адкрылася выстава работаў выхаванцаў выяўленчых студый "Дэкор" і "Творчасць" Дома дзіцячай і юнацкай творчасці. Усяго прадстаўлена больш 50 работ. Для большасці выхаванцаў гэта стала першай спробай.

На здымку: Таня Паляшчук, якая другі год займаецца ў студыі "Дэкор", працуе ў рэдкай тэхніцы - гарачы бацік.



Фота Рамана Кабяка, БелТА.

Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік: ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі: № 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі: 220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў: 231300, г. Ліда-2, п/с 7.
E-mail: ns@lida1.lingvo.grodno.by
http://tbm.org.by/ns/

Рэдакцыйная калегія:
Вадзім Болбас, Міхась Булавацкі, Людміла Дзіцэвіч, Леакадзія Мілаш, Язэп Палубятка, Алесь Петрашкевіч, Людміла Піскун, Уладзімір Содаль, Станіслаў Суднік, Павел Сцяцко, Алег Трусаў.

Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні. 231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Газета падпісана да друку 4. 02. 2002 г.
Наклад 3500 асобнікаў. Замова № 319.
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 418 руб., 3 мес.- 1254 руб.
Кошт у розніцу: 120 руб.